№№91—92
(2611—2612)

8 чэрвеня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

ПОЛИТКУХНЯ

Быть ли пропрезидентской партии?

В Беларуси вновь заговорили о создании пропрезидентской партии. По крайней мере, идеологи на местах вновь патронируют создание региональных объединений общественной организации "Белая Русь".

Напомним, что идея создания организации родилась в Гродно еще перед референдумом, на котором гражданам предлагалось изъять из Конституции ограничение по пребыванию на президентском посту двумя сроками. Тогда наблюдатели и заговорили о том, что по задумке президентской Администрации общественное объединение призвано будет обратиться к Александру Лукашенко с просьбой не уходить. Однако родить поистине массовую организацию в короткие сроки не удалось. Преуспели в этом деле только Гродно и Минск. Потому референдум прошел так, как прошел: Лукашенко сам его инициировал, решив, что народ его поддержит. Однако сейчас вновь возникла необходимость в "Белой Руси".

В минувшие выходные учредительные собрания организации прошли в Городке и Борисове. И это только те адреса, о которых нам известно. О намерении создать гомельскую областную организацию "Белая Русь" официально объявлено в этом областном центре. Что же за политическая кампания готовится на этот раз? Неужели очередной референдум?

Елена НОВИКОВА.

Больш за трох не збірацца...

У мінулы панядзелак (4 чэрвеня) да кіраўніка Мінскай абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) уздзенскага прадпрымальніка Віктара Крываля прыйшоў старшы ўчастковы інспектар Уздзенскага РАУС маёр міліцыі С.У.Бурло. І, як кажуць, паставіў пытанне рубам: маўляў, збірацца групай без спецыяльнага дазволу злачынна.

Міліцыянт нагадаў Крывалю, што парушальніка можа чакаць пакаранне ў выглядзе штрафу альбо пазбаўлення волі на тры гады. І параіў палітыку наматаць гэта на вус. Калі прафілактыка скончылася, Віктар Аляксеевіч высветліў, у чым палягае яго "недаравальны грэх". Аказваецца, так званыя "кампетэнтныя" органы атрымалі інфармацыю аб тым, што ён правёў у сваёй уздзенскай кватэры ўстаноўчы сход Мінскай абласной арганізацыі ствараемага незалежнага прафсаюза прадпрымальнікаў Беларусі.

Вячаслаў ШЫГРОЎ.

«Для серьезного исторического витка необходимы пятнадцать-двадцать лет»

С вице-президентом Польской Академии наук и ее членом-корреспондентом, доктором исторических наук, профессором ***Каролем МОДЗЕЛЕВСКИМ*** *беседует* ***Семен БУКЧИН***

Имя Кароля Модзелевского широко известно в Польше не только потому, что он авторитетный ученый-историк. Может быть, большее число поляков, прежде всего людей старшего поколения, помнят его как одного из первых молодых интеллектуалов, выступивших в середине 60-х годов с призывом к демократизации государства. Тогда же вместе с другим зачинателем польской свободы Яцеком Куронем он был отправлен за решетку. Так, с "Открытого письма" началось движение, приведшее к созданию Комитета по защите рабочих, превратившегося затем в Комитет рабочей и общественной защиты (КОС-КОР). В 70-е годы интеллигентское демократическое движение соединилось с рабочим. Так возникла "Солидарность", благодаря которой в стране произошли коренные общественные преобразования — Польша стала независимым демократическим государством.

Почти двадцатилетний путь новой Польши и сегодня не усеян розами. Страна переживает сложные политические, социальные коллизии, свидетельствующие о том, что построение демократического общества — это долгий и сложный процесс, во время которого совершается нелегкое, даже мучительное познание истинных ценностей — национальных, социальных, культурных... Об этом мы и говорили с Каролем Модзелевским в кафе во дворце Казимира, где находится ректорат Варшавского университета, воспользовавшись перерывом в заседании университетского Сената, членом которого является мой собеседник.

— Как можно охарактеризовать, с учетом множества проблем, переживаемых польским обществом, сегодняшнее состояние польской демократии и в целом самочувствие поляков?

— Полагаю, задавая этот вопрос, Вы не желаете, чтобы я как-то негативно повлиял на демократические общественные ожидания в Беларуси?

— О, можете быть спокойны на этот счет! Белорусы — народ закаленный. Польские проблемы нас не разочаруют. Напротив, возможно, их познание прибавит нам опыта для того, чтобы лучше разбираться в собственных делах.

— Ну тогда будем говорить без обиняков. На мой взгляд, сегодня существует угроза для польской демократии. Не внешняя. Внутренняя. Сразу скажу, что не связываю ее с действиями тех или иных политических сил. Проблема в том, что в немалой части польского общества существует разочарование в демократических порядках и очевидное стремление к тому, что называется "властью твердой руки", если более откровенно, то к полицейскому режиму. Корни нынешнего кризиса польской демократии просматриваются уже в 1989 году, когда собственно были заложены основы демократического строя. Тогда провозглашение демократических порядков было принято в обществе если и не с великим энтузиазмом, то с несомненной верой в их полезность и необходимость для всех граждан страны. Свобода и независимость государства соединялись в общественном восприятии с материальным, личным благополучием и даже процветанием. Люди верили тем лозунгам "Солидарности", которые были провозглашены на рубеже 70—80-х годов, — социальные равенство и защищенность, возможность всем пользоваться общественными благами и прочим. Но начавшиеся экономические реформы оказались весьма болезненными для немалой части нашего общества, которое стало делиться на богатых и бедных. Для последних пришли времена безработицы, утраты социальной безопасности, уверенности в завтрашнем дне.

— Шоковая терапия... Программа Бальцеровича...

— Не будем сейчас говорить о том, можно ли было проводить преобразования по-другому. Но фактом остается то, что облик "Солидарности", как символа общественной справедливости, развеялся и простые люди, поддерживавшие это движение, стали задаваться вопросом: как так получилось, что страна в целом выиграла, а лично мы ничего не только не получили от этой победы, но стали жить еще хуже, чем до нее? Получалось, что кто-то украл у людей эту победу. Спрашивается: кто?

— О, это самый главный вопрос: кто украл, кто именно виноват в наших несчастьях? Кажется, для поляков ответ тот же, что и для многих граждан исчезнувшего Советского Союза: сионисты, мировой капитал, ЦРУ... Ну для вас еще, конечно, рука Москвы...

— Конечно, объяснений может быть множество... Но кому можно было предъявить конкретно свой протест? Конечно, власти. И вот рабочие закрытых фабрик шли к зданиям местной и центральной власти и скандировали: "Воры! Воры!" Ну и если те демократы-реформаторы первой волны, которые пришли к власти после "круглого стола" (я имею в виду правительство Мазовецкого) оказались "ворами", во всяком случае людьми, не оправдавшими общественных ожиданий, то естественно, что этой разочарованностью поспешили воспользоваться так называемые посткоммунистические политические силы, в той или иной степени ведшие свою родословную от польской компартии — Союз левой демократии и ему подобные. Дважды избиратели приводили их к руководству страной. И тем не менее общественные ожидания эта власть также не оправдала.

— Времена Квасьневского, Миллера...

— Ну да... И тогда снова зазвучал старый крик: "Воры!" И снова нашлась политическая партия, которая откликнулась на это общественное негодование.

(Продолжение на 5-й стр.)

МАНІТОРЫНГ

Вячаслаў ОРГІШ, доктар філасофскіх навук

Якім шляхам пойдуць беларусы?

Стратэгія чакання

Як вядома, на Кангрэсе дэмакратычных сіл сутыкнуліся два падыходы да барацьбы за дэмакратыю. Распрацоўшчыкі прынятай стратэгіі ішлі, як яны лічаць, ад жыцця. Народ, маўляў, не спяшаецца выходзіць на вуліцу. Калі так, то варта паспрабаваць зайсці з другога боку. Эканамічны крызіс, які пачаўся пасля расійска-беларускага нафтагазавага канфлікту, непазбежна прыцісне рэжым да сцяны, і ў яго не застанецца варыянтаў, апрача дыялогу з аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі. Неабходна цярпліва чакаць, калі "Чырвоны дом" пакліча дэмакратаў за стол перамоў. А да гэтага моманту трэба тлумачыць народу тупіковасць афіцыйнага сацыяльна-эканамічнага курсу, сэнс ліберальных каштоўнасцяў, знаёміць грамадскасць з "Малой канстытуцыяй", вербаваць на бок апазіцыі наменклатуру, чыноўнікаў.

Ці грунтуецца такая стратэгія на выніках сацыялагічных даследаванняў? Вось некаторыя лічбы Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, які афіцыйна зарэгістраваны ў Вільнюсе, але мае магчымасць праводзіць маніторынг у Беларусі. Калі ў кастрычніку 2006 года паляпшэнне свайго матэрыяльнага становішча адзначаў кожны пяты рэспандэнт, то зараз — толькі кожны сёмы. Колькасць жа тых, хто адчуў пагаршэнне свайго становішча, вырасла амаль у 1,3 раза. Таму зусім не дзіўна, што расце сацыяльны песімізм. Сёння толькі кожны чацвёрты верыць у тое, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў бліжэйшыя гады можа палепшыцца, хаця паўгода таму такой веры прытрымліваліся 42 працэнты апытаных. За гэты перыяд больш як удвая вырасла колькасць тых, хто прагназуе пагаршэнне сітуацыі.

Відавочна, што час і абставіны працуюць на дэмакратыю, лічаць аўтары і прыхільнікі прынятай стратэгіі. Сацыяльна-эканамічны крызіс вымусіць "Чырвоны дом" дамаўляцца з апазіцыяй. "Вуліцу" як інструмент палітычнага ціску на рэжым адмаўляць нельга, але на дадзеным этапе яе роля — другасная.

Што думае народ

Менавіта з гэтым, як патлумачыў Мікола Статкевіч, адказваючы на пытанні "Народнай волі", не пагаджаюцца прыхільнікі альтэрнатыўнай стратэгіі. Пагаршэнне матэрыяльнага "самаадчування" насельніцтва толькі тады адыграе сваю ролю ў барацьбе з рэжымам, калі "вуліца", "вулічны" ціск будуць галоўнай праявай барацьбы дэмакратычных сіл.

Якія падставы для такога радыкальнага падыходу дае сацыялогія? Даследаванне паказвае, што ў акцыях пратэсту супраць пагаршэння свайго матэрыяльнага становішча гатовы браць удзел 18,1 працэнта апытаных. Хтосьці скажа: нават менш за пятую частку насельніцтва. Аднак толькі ў сталіцы гэта 200 тысяч патэнцыяльных пратэстуючых, а па краіне — каля 2 мільёнаў! А яшчэ трэба ўлічваць дынаміку росту пратэстных настрояў. У жніўні 2006 года ўдзельнічаць у вулічных акцыях выказвалі гатоўнасць 8,8 працэнта апытаных, сёння іх удвая больш. Таксама варта ўзгадаць, што падчас украінскай рэвалюцыі 2004 года сацыялагічныя апытанні фіксавалі гатоўнасць украінцаў да вулічных акцый пратэсту на ўзроўні 18—20 працэнтаў.

Працэсы ў Беларусі, якія зараз набіраюць абароты, на думку Статкевіча, патрабуюць ад дэмакратаў максімальнай канцэнтрацыі і мабілізацыі. Інстытут жа сустаршынства ў кіраванні Палітсаветам АДС, уведзены Кангрэсам, зніжае мабілізацыйныя магчымасці апазіцыі і, у рэшце рэшт, пагоршыць стан спраў у дэмакратычным руху. *"Як вядома, структура кіравання АДС залежыць ад прынятай стратэгіі. У сваю чаргу сэнс стратэгіі палягае ў тым, як весці да перамогі. Стратэгіі, якую зацвердзілі, падыдзе і такая структура кіравання, якая абрана. Бо, па сутнасці, гэта стратэгія чакання, спадзяванняў на тое, што ўлада сама зменіцца, эвалюцыянірує. Вобразна кажучы, калі сядзець у балоце і чакаць, што ўлада прыйдзе да балота і папросіць за "круглы стол" дзяліць уладу, то не важна, хто на якой купіне сядзіць (хто вышэй, а хто ніжэй). Бяздзейнасць не патрабуе эфектыўнага кіравання".*

Калі ідэя сустаршынства цалкам увасобіцца, то будзе наступны этап, звязаны з абвастрэннем саперніцтва пэўных асоб за лідэрства, — прагназуе вядомы палітык. Бо гэтыя асобы, якіх усе добра ведаюць, у першую чаргу дбаюць аб сваёй палітычнай кар'еры. *"Пры гэтай стратэгіі чакання большасць дэмакратычных сіл, арыентаваных на барацьбу, на Еўропу, утвораць не фармалізаваны, а рэальны цэнтр барацьбы. Інакш кажучы, пытанне змагання з рэжымам усё роўна будзе вырашацца больш канструктыўна. Каб рабіць справу, не трэба ўсіх збіраць. Калі нехта не хоча ісці пад еўрапейскі сцяг, то гэта можна зрабіць частцы палітычнай апазіцыі".*

Відавочна, што выбар той ці іншай стратэгіі азначае выбар таго ці іншага вектара знешнепалітычнай арыентацыі і ўносіць раскол у шэрагі дэмакратычнай апазіцыі. Сацыялагічнае даследаванне паказвае, што адпаведны раскол існуе і ў самім грамадстве. Інтэграцыйныя (праўсходнія) настроі канкуруюць у грамадскай свядомасці з настроямі празаходнімі, хаця за апошні год колькасць прыхільнікаў праўсходняга вектара зменшылася амаль на 10%, а празаходняга павялічылася на 5%. Сёння на пытанне *"Калі б давялося выбіраць паміж аб'яднаннем з Расіяй і ўступленнем у Еўрасаюз, што б Вы выбралі?"* 46,9 працэнта апытаных аддалі перавагу аб'яднанню з Расіяй, 34,4 працэнта — уступленню ў ЕС. Сярод прыхільнікаў праўсходняга вектара большасць жанчын, людзей сталага ўзросту, малаадукаваных, пенсіянераў, жыхароў усходніх рэгіёнаў і дробных населеных пунктаў. Прыхільнікі празаходняга вектара — людзі больш маладыя і адукаваныя, работнікі недзяржаўнага сектара, студэнты, навучэнцы, жыхары заходніх рэгіёнаў і больш буйных населеных пунктаў. Сярод прыхільнікаў еўравыбару заўважана больш тых, хто канстатаваў пагаршэнне свайго матэрыяльнага становішча, а таксама тых, хто песімістычна глядзіць на сацыяльна-эканамічную перспектыву Беларусі (пры тым, што празаходнікі па ўзроўні даходаў істотна абыходзяць сваіх праўсходне арыентаваных суграмадзян). Сярод прыхільнікаў прарасійскага вектара больш тых, хто глядзіць на беларускую сітуацыю з аптымізмам, а таксама тых, хто не стаў бы ўдзельнічаць у акцыях пратэсту супраць пагаршэння свайго матэрыяльнага становішча (80,5%).

На шалях — суверэнітэт

Такім чынам, раскол, што назіраецца ў шэрагах апазіцыі, фактычна адлюстроўвае сітуацыю ў беларускім грамадстве, якое падзялілася ў залежнасці ад падтрымкі прарасійскай, альбо празаходняй, стратэгіі развіцця беларускага грамадства. Канфлікт, які прарэзаўся на Кангрэсе, у перспектыве будзе развівацца і прывядзе да размежавання левых і правых, праўсходніх і празаходніх накірункаў апазіцыі. *"На жаль, гэта непазбежна, будуць вымалёўвацца два апазіцыйныя цэнтры"*, — перакананы Мікола Статкевіч.

Што азначае прарасійскасць у гэтым кантэксце? Калі за ёй хаваецца жаданне пабудаваць дэмакратычны лад у Беларусі і пры гэтым захаваць нейкую лаяльнасць да Расіі, то гэта яшчэ нічога. А калі наадварот? *"Я думаю, што людзі спадзяюцца паабяцаць прадаць крышку суверэнітэту і за гэта, вобразна кажучы, атрымаць ярлык на княжанне. Але, перакананы, з таго боку, калі возьмуцца фундаваць, будуць разлічваць на іншае. Будуць намагацца атрымаць больш, чым дае Лукашэнка".*

Гэта значыць, што Масква (у абмен на пратэкцыю) захоча з дапамогай прарасійскіх палітыкаў атрымаць кантроль над эканамічным і палітычным суверэнітэтам Беларусі. Наколькі такая гульня супадае з настроямі беларусаў? Перш за ўсё трэба разумець, што рэспандэнты, якія выказаліся за аб'яднанне з Расіяй, мелі на ўвазе тую ці іншую форму саюза з ёй. Каб пераканацца, што гэта так, варта паглядзець адказы на пытанне "Якому варыянту інтэграцыі Беларусі і Расіі Вы асабіста аддасцё перавагу?" *(гл. табліцу)*.

Лёгка заўважыць, што колькасць тых, хто жадае аб'яднання дзвюх дзяржаў у адну, на працягу некалькіх год істотна скарацілася, затое рэзка вырасла колькасць прыхільнікаў поўнай незалежнасці Беларусі. Разам з тымі, хто згодны на інтэграцыю Беларусі і Расіі пры ўмове захавання яе суверэнітэту, яны ўтвараюць абсалютна дамінуючую кагорту беларускіх грамадзян. Разлічваць, што гэтыя грамадзяне пойдуць за тымі палітыкамі, хто пакліча іх безаглядна ісці пад расійскі трыкалор, зразумела, не даводзіцца. Праблема, аднак, у тым, што многім беларусам сёння яшчэ цяжка зрабіць выбар і на карысць інтэграцыі з Еўрасаюзам.

Аднак выбар рабіць усё ж прыйдзецца. Галоўнае, каб не спазніцца. Бо гульня з Масквой, якую вядзе частка палітычнай апазіцыі, перш за ўсё левыя на чале з камуністамі, небяспечная, — упэўнены адзін з лідэраў беларускай сацыял-дэмакратыі і прынцыповы празаходнік Мікалай Статкевіч. *"Яна небяспечная для суверэнітэту краіны".*

Мабыць, Мікалай Віктаравіч мае рацыю. Але ж, як паказаў нядаўні Кангрэс, складанасць у тым, што так разумеюць праблему далёка не ўсе.

Табліца

Варыянт адказу	2'02	03'03	1'04	09'05	2'05	05'07
Беларусь і Расія павінны ўтварыць саюз незалежных дзяржаў, звязаных цеснымі палітычнымі і эканамічнымі адносінамі	51,7	48,0	47,8	50,6	52,3	43,5
Адносіны Беларусі і Расіі павінны быць такімі ж, як і з іншымі краінамі СНД	19,7	19,3	32,1	28,9	20,7	41,6
Беларусь і Расія павінны стаць адной дзяржавай, з адным прэзідэнтам, урадам, арміяй, сцягам, валютай і т.п.	21,2	25,6	11,6	13,2	12,0	8,3

ГУЧНАЯ СПРАВА

Турэмны шансон

Дзяржаўны абвінаваўца папрасіў прыгаварыць вядомага выканаўцу Віктара Каліну да шасці гадоў пазбаўлення волі, яго жонку Святлану Каліну — да пяці.

Нагадаем, слуханне па справе В.Каліны і яго жонкі пачалося 29 мая. Віктару Каліне інкрымінуюцца махлярскія дзеянні, якія ён учыніў для атрымання страхоўкі за нібыта выкрадзены аўтамабіль. В.Каліна абвінавачваецца ў арганізацыі махлярства ў асабліва буйным памеры (ч.4 арт.16 і ч.4 арт.209 КК), арганізацыі заведама падманнага даносу (ч.4 арт.16 і ч.2 арт.400 КК) і заведама падманным паказанні (ч.2 арт.401 КК). Святлана Каліна абвінавачваецца ва ўчыненні махлярства ў асабліва буйным памеры (ч.4 арт.209 КК).

Паводле слоў дзяржаўнага абвінаваўцы, муж і жонка прадалі аўтамабіль "Мерседэс-Бенц", а пазней заявілі аб яго выкраданні ў Маскве ў праваахоўныя органы Расійскай Федэрацыі. Жонка спевака была затрымана ў Мінску пры атрыманні страхоўкі за нібыта выкрадзеную машыну.

На судзе 29 мая В.Каліна заявіў аб сваёй невінаватасці ў махлярстве. Ён прызнаў віну толькі ў тым, што часткова даваў заведама падманныя паказанні. Яго жонка не прызнала сваю віну наогул.

Прыгавор па справе Віктара Каліны і яго жонкі будзе абвешчаны 12 чэрвеня.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

Страшны ўлоў

Пракуратура Ленінскага раёна сталіцы распачала крымінальную справу па ч.1 арт.139 (забойства) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь па факце знаходкі ў рацэ Свіслач астанкаў чалавека.

Як паведамілі БелаПАН у ГУУС Мінгарвыканкама, 3 чэрвеня ў 22.18 рыбак выловіў насупраць дома 48/1 па вуліцы Якубава сумку, у якой знаходзіўся загорнуты ў поліэтылен шкілетаваны чэрап чалавека з прыкметамі цялесных пашкоджанняў. Чэрап, як мяркуецца, належыць мужчыне 20—25 гадоў. Прызначана экспертыза, праводзіцца расследаванне.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

СКАНДАЛ

ФПБ подделала подписи?

Официальные белорусские профсоюзы во главе с Леонидом Козиком инициировали кампанию протеста против исключения Беларуси из Генеральной системы преференций. Напомним, что по оценкам экспертов отмена преференций для нашей страны означает потери в 300—400 миллионов долларов.

Санкции могут вступить в силу с 21 июня, и если это произойдет, то связаны они будут с несоблюдением прав профсоюзов в нашей стране.

Несмотря на то, что белорусская делегация во главе с вице-премьером Андреем Кобяковым предприняла несколько попыток, переговоры в Женеве в штаб-квартире Международной организации труда успехов не принесли. В ответ белорусские официальные профсоюзы предприняли шаг отчаяния — инициировали кампанию обращений белорусских трудящихся с просьбой не исключать Беларусь из Генеральной системы преференций. Появилось и аналогичное обращение представителей "дружественных" профсоюзов. И вот тут разразился скандал. Оказалось, что ФПБ использовала подписи коллег, которые были поставлены под совершенно другим документом.

В этой связи председатель Федерации независимых профсоюзов России Михаил Шмаков обратился с письмом к главе ФПБ Леониду Козику, где заявил, что в Минске были подделаны подписи представителей российских профсоюзов под обращением к Еврокомиссии с требованием не исключать Беларусь из Генеральной системы преференций.

Как пишут "Известия", о факте подделки подписей в Минске сообщил председатель Международного объединения профсоюзов металлистов Николай Шатохин. *"Из-за безответственности некоторых сотрудников ФПБ" профсоюзы разных стран были дезинформированы о том, что члены МОП поставили свои подписи под обращением ФПБ. "Каково же было наше удивление, когда мы увидели скопированные подписи участников нашего заседания под обращением "Группы трудящихся МОТ", которое мы не подписывали"*, — заявил Н.Шатохин.

По его словам, МОП пришлось извиниться перед международным профсоюзным движением после того, как ФПБ использовала их подписи в своем обращении. *"Ставить наши подписи под чужими документами — это просто неприлично"*, — сказал Шатохин.

"С недоумением я воспринял факс о фальсификации подписей участников заседания МОП металлистов в Минске под обращением представителей "Группы трудящихся МОТ" к Европейской комиссии по вопросу исключения из Генеральной системы тарифных преференций Европейского Союза. Мне кажется, что подобная "ошибка технического работника" нанесла серьезный вред консолидированной позиции профсоюзов", — говорится в письме председателя Федерации независимых профсоюзов России.

В свою очередь независимые профсоюзы Беларуси всю ответственность за возможное исключение Беларуси из Генеральной системы преференций возложили на официальные власти. В частности, независимый профсоюз радиоэлектронной промышленности выступил со специальным заявлением на сей счет. По мнению представителей профсоюза РЭП, "сознательно в течение многих лет не ставятся на учет в местных исполнительно-распорядительных органах первичные профсоюзные организации профсоюза РЭП в Могилеве, Гродно, Минске, что лишает их права легализовать свою деятельность по защите прав членов профсоюза... По-прежнему преследуются работники — члены профсоюзов, не входящих в ФПБ. Также членство в независимом профсоюзе является первопричиной непродления контрактов, несмотря на высокую квалификацию работников. В последнее время правительство активно инициирует проект закона о профсоюзах, с принятием которого независимые профсоюзы практически прекратят свое существование".

Профсоюз РЭП обратил внимание на то, что "профсоюзные вожди" из ФПБ не говорят правду членам своих профсоюзов, что торговые преференции — это уменьшение торговых пошлин на экспортную продукцию, своего рода премия, которую Евросоюз установил именно для стран, соблюдающих права трудящихся и профсоюзов. И уж коль белорусские власти не желают соблюдать эти права, то и обижаться им надо только на самих себя.

Олег СНОВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

СКАНДАЛ

Юрась Алейнік будзе судзіцца з Акадэміяй кіравання

Ён скончыў школу з залатым медалём. На ўступных экзаменах у Акадэмію набраў другую суму балаў сярод усіх абітурыентаў — 27 па трох прадметах. Яго сярэдні бал за чатыры курсы навучання ў ВНУ — 8,4, а апошнюю сесію Юрась Алейнік здаў на ўсе "дзевяткі".

І ўсё ж яго адлічылі з Акадэміі кіравання з такой звыклай для сучаснай Беларусі фармулёўкай — "за сістэматычнае парушэнне вучэбнай дысцыпліны і правілаў унутранага распарадку". Адразу ж выкінулі з інтэрната, а ў будынак акадэміі дазваляюць заходзіць толькі ў прысутнасці супрацоўнікаў службы аховы.

Менавіта па такім сцэнарыі ў мінулым годзе падчас прэзідэнцкіх выбараў выціскалі з вядучых ВНУ краіны студэнтаў, якія бралі актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны. Толькі па праграме Каліноўскага сёння ў Польшчы навучаецца 300 адлічаных з ВНУ на радзіме беларускіх студэнтаў. У гэтым годзе аб'яўлены конкурс яшчэ на 100 месц.

— Мяне адлічылі імгненна, — расказвае Юрась. — Раніцай 16 мая я прыйшоў на валейбольны матч. З раздзявальні — я нават не паспеў пераапрануцца — мяне выклікалі ў дэканат. Там ужо знаходзіліся тры намеснікі дэкана, дакладней сказаць, намеснікі дырэктара Інстытута дзяржаўнага кіравання і эканомікі, у якім я навучаюся. Мне паведамілі, што ўчора я быў адлічаны з Акадэміі. Падстава — 22 гадзіны пропуску заняткаў у красавіку, а таксама неактыўны ўдзел у грамадскім жыцці краіны. Ніхто не пацікавіўся, па якой прычыне я адсутнічаў, не спытаў, ці ёсць у мяне адпаведны дакумент. А я, напрыклад, хварэў і маю бюлетэнь. Калі падлічыць, то атрымаецца, што толькі 6 гадзін заняткаў я прапусціў без уважлівай прычыны. Што тычыцца грамадскага жыцця, то мне сказалі, што быццам бы я не браў удзел у апошніх мясцовых выбарах. Так, я сапраўды не галасаваў, але ж я быў назіральнікам на тых выбарах. Хто можа сказаць, што гэта меней адказна, чым непасрэдна галасаванне? Але гэта нікога не цікавіла. Мне нават не далі азнаёміцца з загадам. Паказалі ліст, а потым вывесілі яго на дошцы аб'яў.

Я думаю, што сапраўднай прычынай майго адлічэння, як гэта ўжо здаралася не раз у Беларусі, стала мая грамадзянская пазіцыя. Я ніколі не ўтойваў сваіх поглядаў, у дэканаце ведалі, што я ўдзельнічаю ва ўсіх санкцыянаваных мерапрыемствах апазіцыі, што я сябра ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" і ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны". У мінулым годзе пасля "Чарнобыльскага Шляху" ў мяне і яшчэ трох такіх, як я, студэнтаў адбылася размова з намеснікам рэктара па выхаваўчай працы Таццянай Печанёвай. Аднак тады яна сказала, што нам дадуць давучыцца, а вось ужо пры размеркаванні... сашлюць па інтарэсах, у чарнобыльскую зону... Я думаю, што апошняй кропляй для адміністрацыі стаў і той факт, што ў красавіку я арганізаваў сярод студэнтаў Акадэміі збор подпісаў супраць адмены льгот. Сабраў больш за паўтысячы подпісаў. Уяўляеце, па сутнасці, Адміністрацыя прэзідэнта ініцыявала законапраект аб адмене льгот, а студэнты, якія навучаюцца ў прэзідэнцкай установе, выступілі супраць!

— Вы адзіны студэнт, які папаў пад адлічэнне?

— У загадзе ўзгадваюцца яшчэ чатыры прозвішчы. 21 студэнту аб'яўлена вымова. Я даведаўся, што ў некаторых гэта ўжо другая вымова за семестр. А ў мяне ў гэтым семестры вымоў не было. Тыя, каго адлічылі, вучыліся вельмі дрэнна, пераздавалі экзамены амаль кожную сесію і мелі сапраўды шмат пропускаў. Мяне, атрымліваецца, паставілі з імі ў адзін шэраг.

Услых ніхто з адміністрацыі Акадэміі не сказаў, за што рэальна мяне адлічылі. Знайшоўся толькі адзіны чалавек з адміністрацыі, які на вуха мне прашаптаў: *"Юрась, ты ж разумееш, што цябе адлічылі не за прагулы, а за пазаакадэмічную дзейнасць"*. Чаму ж тады чэсна не напісаць, што я адлічаны за палітыку?!

Самае прыкрае, што мяне адразу ж выкінулі з інтэрната. Нават не дазволілі забраць асабістыя рэчы. 31 мая, калі я прыйшоў у інтэрнат, вахцёр выклікаў міліцыю і ўчастковага. Жах ды і толькі! Участковы нават параіў мне напісаць скаргу ў пракуратуру. У Акадэмію мне таксама не дазваляюць зайсці. Калі я туды прыйшоў адразу пасля адлічэння, да мяне прыставілі ахоўніка, які хадзіў за мною з кабінета ў кабінет. А пасля выклікалі начальніка службы аховы Акадэміі, які, дарэчы, знаходзіўся ў адпачынку. Рэктар Станіслаў Князеў адмаўляецца прыняць мяне. Кожную сераду з 15 да 17 гадзін ён вядзе прыём па асабістых пытаннях. Я спрабаваў праз яго дарадцу запісацца на гэты прыём, і кожны раз мне адмаўлялі ў сустрэчы. Дарадца Сяргей Сабалеўскі казаў, што ў рэктара няма часу для сустрэч.

— Юрась, а чаму ў свой час Вы вырашылі паступаць менавіта ў Акадэмію пры прэзідэнце ды яшчэ на такі факультэт — дзяржаўнае кіраванне?

— Ведаеце, сёння ў краіне адно дзяржаўнае кіраванне, а заўтра — іншае. Трэба ж рыхтавацца... Да таго ж пасля школы мяне адразу без іспытаў прымалі ў БДУ на эканамічны факультэт. Дома на сямейным савеце мы вырашылі, што спачатку я паспрабую паступіць у Акадэмію кіравання. Установа сур'ёзная, конкурс вялікі. І я паступіў. Усе экзамены здаў на "дзевяткі".

Я вельмі люблю вучыцца. Нас у бацькоў тры сыны. І ўсе мы прагнем ведаў. Сёлета мой старэйшы брат з чырвоным дыпломам скончыў маскоўскі МДІМА (МГИМО), зараз рыхтуецца да паступлення ў аспірантуру. Малодшы яшчэ школьнік, вучыцца выдатна. У гэтым годзе я паралельна паступіў у БДУ на факультэт сацыяльных тэхналогій на спецыяльнасць рэферэнт-перакладчык. Пасля заканчэння Акадэміі збіраўся атрымаць яшчэ і юрыдычную адукацыю.

— Вы былі задаволены ведамі, якія атрымлівалі ў Акадэміі?

— Я амаль скончыў чатыры курсы, засталіся толькі залікі і іспыты, таму, напэўна, магу даць нейкую ацэнку ведам. У свой час Акадэмія кіравання ствараласяк установа, куды за другой адукацыяй паступалі кіраўнікі розных узроўняў і ўжо потым з'явіўся інстытут студэнцтва, куды ішлі выпускнікі школ. І мне здаецца, што адукацыю студэнты атрымліваюць слабую, таму што няма спецыялізацыі. Выходзіш з установы і не кіраўніком, і не эканамістам. Таму я для сябе вырашыў атрымаць абавязкова яшчэ адну адукацыю. Менавіта гэта і стала прычынай таго, што паралельна вучыўся ў БДУ.

— Вы маеце намер даказаць праз суд, што Вас адлічылі незаконна?

— Так. У панядзелак 4 чэрвеня я падаў іскавую заяву ў суд. Адказчыкам па справе будзе Акадэмія кіравання пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У заяве я пішу, што парушаны мае правы і парушаны прынцып Канстытуцыі пра недапушчальнасць дыскрымінацыі. З абаронцам мы налічылі 6 пунктаў дыскрымінацыі ў дачыненні да мяне.

Ведаеце, занадта шмат ва ўсёй гэтай справе хібаў, адчуваецца непадрыхтаванасць з боку адміністрацыі. Такое ўражанне, што рашэнне ў адносінах да мяне прымалася ў апошнюю хвіліну.

— Юрась, Вы не адзіны студэнт, які праз суд хоча дамагчыся аднаўлення ў ВНУ. У 2006 годзе Таццяна Хома — таксама выдатніца, якая, як і Вы, была афіцыйна адлічаная з эканамічнага універсітэта за пропускі заняткаў, — звярталася ў суд. Яе справа скончылася тым, што суд прызнаў адлічэнне справядлівым. Сёння Таццяна — студэнтка аднаго з аўстрыйскіх універсітэтаў. Што Вы збіраецеся рабіць у выпадку, калі не атрымаецца даказаць праз суд неправамернасць Вашага адлічэння?

— Першая мая рэакцыя на адлічэнне — 5 хвілін шоку. А потым я зразумеў, што трэба нешта рабіць, трэба бараніць свае правы. За два тыдні я абышоў шмат якія інстанцыі, сустракаўся нават з кіраўніком офіса АБСЕ ў Мінску Оке Петарсанам. Яго вельмі зацікавіла мая справа, асабліва той момант, што ў маю падтрымку выступіла 250 студэнтаў. На іх аказваецца жорсткі ціск, іх выклікалі ў дэканат, і некалькі чалавек адазвалі свае подпісы. Наколькі мне вядома, на імя рэктара была пададзена заява, якую падпісалі 228 студэнтаў. Пераважна гэта мае аднакурснікі і суседзі па інтэрнаце. Многія з іх збіраюцца ісці ў суд бараніць мае правы. Ведаеце, можа, гэта дзіўна будзе гучаць, але я нават удзячны гэтаму адлічэнню за тое, што я пабачыў, колькі ў мяне сапраўдных сяброў...

А што тычыцца будучыні... Ужо зараз паступаюць прапановы вучыцца ў Кіеве, Маскве, Вільнюсе, Варшаве. Але я вельмі хачу вучыцца на Радзіме.

— Юрась, апошняе пытанне. Як родныя ўспрынялі навіну аб Вашым адлічэнні?

— Я сказаў бы, мужна. Хаця апошнім часам маці прыходзіцца вельмі складана, здароўе падарвала, хапіла ёй нервовых сітуацый з-за маёй грамадзянскай пазіцыі... У сакавіку мінулага года пасля прэзідэнцкіх выбараў я, вядома ж, быў на Кастрычніцкай плошчы. Мяне затрымалі, але не арыштавалі, на мяне павесілі крымінальную справу, якую, дзякуй богу, праз два месяцы прыкрылі. Цяпер перад кожнай акцыяй апазіцыі і нават тады, калі ў горадзе што здарыцца, да мяне дадому ў Маладзечне прыходзяць міліцыянты з крымінальнага аддзела. Бацька звычайна на працы, таму ўсе размовы яны вядуць з маці.

Але я хацеў бы сказаць сваім бацькам вялікі дзякуй за падтрымку. Яны адразу ж сказалі: будзем трымацца разам, каб перамагчы гэтую несправядлівасць.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ЗВАНОК У АКАДЭМІЮ КІРАВАННЯ

Дарадца рэктара Сяргей Сабалеўскі кажа, што студэнт 4-га курса Юрась Алейнік быў адлічаны з Акадэміі за сістэматычныя пропускі заняткаў. Па яго словах, літаральна кожны месяц адзін-два навучэнцы Акадэміі па гэтай прычыне пазбаўляюцца студэнцкіх білетаў. Ён, праўда, не патлумачыў, што значыць *"сістэматычныя пропускі заняткаў"*. Калі за гэта выключылі выдатніка Ю.Алейніка, то што казаць пра дзесяткі, а можа і сотні студэнтаў-парушальнікаў, адзнакі якіх значна горшыя.

— *Выпадак з Алейнікам самы шараговы*, — так, працягваючы размову, пракаменціраваў сітуацыю з адлічэннем Юрася Алейніка Сяргей Сабалеўскі. — *Ён некалькі гадоў не хадзіў на заняткі* (і як гэта хлопец умудрыўся заставацца выдатнікам і дайшоў амаль да апошняга курса? — **Рэд.**). *Па-чалавечы яго шкада. Але талент і веды не пазбаўляюць чалавека, тым больш будучага дзяржаўнага служачага, ад неабходнасці адказваць за свае ўчынкі. На другім курсе Юрый Алейнік меў вымовы і папярэджанне за пропускі заняткаў, на трэцім курсе ў яго была вымова і на чацвёртым таксама. За пропускі трэніровак яго адлічылі з каманды па валейболе. З боку Акадэміі не было ніякіх парушэнняў нарматыўнай базы. Калі ён мяркуе, што яго адлічылі незаконна, можа звяртацца ў суд.*

Калі слухаць спадара Сабалеўскага, то Ю.Алейніка пакаралі справядліва. А дзе логіка? Атрымліваецца, што выдатнікі вучобы не патрэбны Акадэміі кіравання пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь?

ПРАТЭСТ

Студэнты пратэстуюць

Студэнты Вышэйшай школы турызму Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта звярнуліся да прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі ў сувязі з разбурэннем будынкаў гістарычнай часткі Гродна.

У звароце, які падпісалі 128 студэнтаў, гаворыцца пра "варварскія спробы ўлад горада Гродна на чале са старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам Саўчанкам знішчыць цэлы комплекс унікальных помнікаў архітэктуры XVIII — пачатку XIX стагоддзяў, пазбавіўшы тым самым каралеўскі горад Гродна цэлай эпохі ягонага гістарычнага развіцця".

У лісце прыводзяцца факты парушэння заканадаўства, у тым ліку разбурэння фрагментаў культурнага пласту XIV—XVIII стагоддзяў на вуліцы Маставой і XVI—XVII стагоддзяў ва ўсходняй частцы Савецкай плошчы, знос дома па вуліцы Урыцкага, 23, разбор брукаванкі XIX — пачатку XX стагоддзяў, а таксама пашкоджанне некалькіх будынкаў XVIII—XIX стагоддзяў.

"У далейшых планах па перабудове гэтага раёна Гродна стаіць знішчэнне цэлага гістарычнага квартала Новы Свет, утворанага вуліцамі Міцкевіча—17 верасня—Астроўскага, знос шэрагу будынкаў у квартале вуліц Тэльмана—Гарадніцанская—Калючынская—Кіра ва і разбурэнне унікальнага ў нацыянальным маштабе будынка ў стылі мадэрн па вуліцы Сацыялістычнай, 44. Усе згаданыя дзеянні праходзяць пад прыкрыццём рэканструкцыі і рэстаўрацыі, аднак маюць на мэце будаўніцтва даходных муляжоў і вядуць да руйнавання Гродна, горада з тысячагадовым багажом гісторыка-культурных традыцый ды помнікаў. Як патрыёты сваёй краіны і будучыя працаўнікі ў сферы турызму, мы не можам са спакойным сэрцам назіраць за тым, як на карысць прыватным камерцыйным інтарэсам чыноўнікаў сціраецца з твару зямлі культурная спадчына не толькі нашага народа, але і ўсяго чалавецтва", — адзначаецца ў звароце.

Марат ГАРАВЫ.

ДЫПКУР'ЕР

У штаб-кватэры СНД будзе новы кіраўнік?

Афіцыйныя прадстаўнікі знешнепалітычных установаў дзяржаў СНД ніяк не каментуюць чуткі пра тое, што кандыдатура былога старшыні расійскага Цэнтрвыбаркама Аляксандра Вешнякова ўзгадняецца на пасаду выканаўчага сакратара СНД. Аднак неафіцыйна крыніца ў Міністэрстве знешніх сувязяў Кіргізіі пацвердзіла "Коммерсанту" гэтую інфармацыю.

Газета сцвярджае, што кандыдатура Вешнякова нават абмяркоўвалася на саміце кіраўнікоў урадаў 25 мая ў Ялце.

Дарэчы, днямі сам Аляксандр Вешнякоў таямніча паведаміў журналістам: "Я прыняў прапрапанову прэзідэнта Расіі аб далейшай працы. Думаю, ў бліжэйшыя два-тры тыдні пра гэта можна будзе гаварыць".

Алег СНОЎ.

АДКРЫТЫМ ТЭКСТАМ

Слугі не народа, а аднаго чалавека

"Дэпутат — слуга народа", — казалі некалі савецкія прапагандысты. Тады мы не надта задумваліся над гэтымі словамі, як, дарэчы, і над многім іншым. Хоць, у прынцыпе, ведалі, што дэпутаты нічога не вырашаюць і ніякія яны не слугі народа, яны штампавалі тыя законы, якія падсоўваліся ім галоўным штабам КПСС — яе Палітбюро.

На жаль, сёння, можна сказаць, тое ж самае. Толькі замест КПСС — Адміністрацыя прэзідэнта, а замест Палітбюро — сам прэзідэнт. Паглядзіце, як галасуюць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. За адмену льгот націснулі кнопкі ўсе, акрамя адной Вольгі Абрамавай. Гэта трэба такое адзінадушша!

Разгадка простая — сённяшнія дэпутаты не з'яўляюцца слугамі народа, яны слугі аднаго чалавека. Сказалі так прагаласаваць — прагаласуюць. Скажуць за адзін дзень прыняць пяць законаў — прымуць. Што ім да інтарэсаў мільёнаў людзей, яны, упэўнены, у большасці днём і ноччу думаюць пра свае асабістыя інтарэсы. І яны ўлічваюцца тым, хто цяпер кіруе краінай. У "Народнай волі" я прачытаў пра пенсію той жа Наталлі Машэравай — амаль паўтара мільёна. Усяго чатыры гады пабыла ў так званай Палаце прадстаўнікоў, а якое заахвочванне!

Цяперашняя выканаўчая ўлада падбірае такіх дэпутатаў, якія ёй патрэбныя, а не народу. Вось чаму яна мёртвай хваткай кантралюе ход выбараў у кожнай акрузе. Падбіраецца тое кола людзей, якія, калі трапляюць у Палату прадстаўнікоў, поўнасцю губляюць голас. Што, яны не бачаць, куды коціцца краіна? Бачаць, але маўчаць. Што, яны не ведаюць, што без змены заканадаўства ў нас ніколі не будзе дэмакратычных выбараў? Ведаюць, але ім без гэтага жывецца нармальна. За апошнія гады неаднойчы паведамлялася пра павышэнне заробкаў "слуг народа", а ў простых людзей — кот наплакаў. Адным словам, з вантробамі прадаліся "прызначаныя" дэпутаты. Таму і вынік іх працы выклікае абурэнне.

У краіне дзейнічае закон аб кантрактнай сістэме найму на працу. Гэта ж як пры рабаўладальніцкім ладзе! Крок у бок — і цябе звальняюць. Ты, рабочы, фактычна бяспраўны, ты не можаш нават слова сказаць супраць начальства. Дэмакратыяй на заводах, фабрыках, ва ўстановах нават і не патыхае. А дэпутаты той жа Палаты прадстаўнікоў на чале з сябрам Лукашэнкі Канаплёвым робяць выгляд, што ўсё нармальна.

Не, не нармальна. Як і тое, пра што я гаварыў вышэй. Дэпутаты павінны быць сапраўды слугамі народа, а не слугамі аднаго чалавека. Пакуль у нас такога не будзе — не будзе нармальнага жыцця ў мільёнаў людзей.

Мікалай КАЗЫРНІЦКІ, навуковец.

АБІТУРЫЕНТ-2007

Фізікаў больш, чым лірыкаў

Найбольшым попытам у абітурыентаў сёлета карыстаюцца спецыяльнасці фізіка-матэматычнага профілю, паведаміла начальнік цэнтра тэсціравання Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Галіна Віктаровіч.

Паводле яе слоў, на праходжанне цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы зарэгістравалася больш за 127 тысяч чалавек, па фізіцы — каля 52 тысяч. Здаваць тэст па фізіцы выказалі жаданне амаль у два разы больш абітурыентаў, чым летась.

Усяго ж, паводле слоў спецыяліста, на праходжанне тэсціравання па 14 агульнаадукацыйных прадметах было пададзена больш за 558 тысяч заявак, што амаль на 80 тысяч больш, чым у 2006 годзе. Больш за 200 тысяч абітурыентаў будуць здаваць тэст па рускай і беларускай мовах. Таксама папулярнасцю ў абітурыентаў карыстаюцца такія прадметы, як біялогія (больш за 43 тысяч), хімія (каля 22 тысяч), гісторыя Беларусі (38 тысяч), англійская мова (35,5 тысячы). Менш за ўсё жадаючых зарэгістравалася на тэст па іспанскай мове — 641 абітурыент.

Нагадаем, тэсціраванне па беларускай мове пройдзе 12 чэрвеня, рускай — 13 чэрвеня, гісторыі Беларусі — 15 чэрвеня, сусветнай гісторыі найноўшага часу — 17 чэрвеня, матэматыцы — 19 чэрвеня, па прадмеце "Чалавек. Грамадства. Дзяржава" — 21 чэрвеня, геаграфіі — 22 чэрвеня, фізіцы — 23 чэрвеня, біялогіі — 25 чэрвеня, замежных мовах (англійская, нямецкая, французская, іспанская) — 27 чэрвеня, хіміі — 28 чэрвеня.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ПАМЯЦЬ

Жыў не для сябе, а для Радзімы

Мінуў год, як пайшоў з жыцця вялікі патрыёт Беларусі, былы кіраўнік Віцебскай арганізацыі Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" і Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ **Уладзімір ПЛЕШЧАНКА** (1948—2006). Сям'я, сябры і паплечнікі сабраліся ў ягонай роднай вёсцы Вароны Віцебскага раёна. Грамада пад нацыянальнымі бел-чырвона-белымі сцягамі рушыла на могілкі ў суседняй вёсцы Друкава да магілы блізкага, незабыўнага чалавека. Быў урачыста адкрыты надмагільны помнік, створаны на ахвяраванні з усёй Беларусі. Цудоўнага чалавека помняць не толькі на Віцебшчыне.

На пліце — партрэт Уладзіміра Плешчанкі, выявы Крыжа і герба Пагоня. І дэвіз, у якім увасоблены сэнс ягонага гераічнага жыцця — **"Не для сябе, а для Радзімы"**. Людзі выказалі падзяку аўтару праекта помніка скульптару Яну Таўпыгу, цяперашняму кіраўніку Віцебскай арганізацыі Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" і КХП—БНФ.

Зачытваецца слова ад старшыні Партыі Зянона Пазьняка. У прыватнасці, у ім гаворыцца: *"Гэта быў такі чалавек, што памяць пра яго застанецца навечна ў нашай гісторыі змагання за вольную Беларусь...*

Гэта быў наш рыцар, які шматкроць даказаў у змаганні сваю нязломнасць і веру ў светлую будучыню дарагой Бацькаўшчыны. Ён прымусіў сябе паважаць нават ворагаў. Яго дзейнасць была самаахвярнай. Ягонае жыццё было пасвячэннем Беларусі. Калі ў народа ёсць такія людзі, як Уладзімір Плешчанка, Беларусь будзе жыць і светлая будучыня яе настане. На ахвярных людзях трымаецца Бацькаўшчына і адраджаецца нацыя..."

З успамінамі аб патрыёце выступілі ягоныя паплечнікі — в.а. старшыні Фронту і Партыі на Беларусі Юры Беленькі, сакратары ўправы Алесь Чахольскі і Валеры Буйвал, землякі і сябры. Усе гаварылі пра мужнасць, мудрасць і чалавечнасць вялікага беларуса. Памяць аб ім вечна будзе жыць у нашых сэрцах. Ягоны прыклад натхняе нас у барацьбе за вызваленне Айчыны.

Алесь ЧАХОЛЬСКІ, адказны сакратар Управы Сойму КХП—БНФ.

НЕАФІЦЫЙНА

Буш-старэйшы пажадаў Беларусі дэмакратычных перамог

Былы старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі С.Шушкевіч і былы прэзідэнт ЗША Дж.Буш сустрэліся на ўрачыстасцях вядомай амерыканскай газеты "Вашынгтон таймс".

Джордж Буш павінен быў выступіць з прамовай перад гасцямі. Перад выступам да яго на аўдыенцыю запрасілі восем чалавек. Сярод іх апынуўся і Станіслаў Шушкевіч.

— У Вашынгтоне я браў удзел у канферэнцыі Сусветнай федэрацыі Міру, выступаў там з прамовай, — расказвае Станіслаў Шушкевіч. — І менавіта на гэтым форуме я і атрымаў запрашэнне на юбілей газеты "Вашынгтон таймс". Урачыстасці праходзілі ў самай вялікай зале Вашынгтона — Музеі будаўніцтва. Не паспеў я азірнуцца, што да чаго, як да мяне падышлі прадстаўнікі службы аховы і запрасілі разам з жонкай прайсці ў шыкоўна прыбраны пакой. Усяго нас было 8 чалавек, амерыканскія сенатары, вядомыя на ўсю краіну журналісты, прадстаўнік урада Южнай Карэі і я. Хвіліны праз дзве адчынніліся дзверы і зайшоў Джордж Буш-старэйшы. Ён па чарзе з усімі вітаўся. Я сказаў, што ўдзячны за такую ўвагу да маёй асобы, нагадаў, што мы з ім сустракаліся ў Рыо-дэ-Жанейра. А ён у сваю чаргу ўзгадаў, што ўпершыню мы сустрэліся яшчэ ў 1992 годзе ў Хельсінкі, калі Буш быў прэзідэнтам Амерыкі, а я — старшынёй Вярхоўнага Савета Беларусі. Тады яшчэ адбыўся такі камічны эпізод. Нас з Бушам здымалі фотакарэспандэнты Белага дома. На маім пінжаку вісеў бэдж. Джордж Буш яго адшпіліў і сказаў: "Нас і так усе ведаюць".

Размаўлялі экс-кіраўнікі дзяржаў нядоўга. Буш пажадаў Беларусі дэмакратычных перамог. Выступіць перад гасцямі экс-прэзідэнт ЗША не паспеў. Раптоўна ў зале спрацавала пажарная сігналізацыя, і ўсе пачалі выходзіць з пакою. Пасля высветлілася, што трывога была несапраўднай. Аднак Джордж Буш у залу не вярнуўся. Замест яго прамовы госці слухалі канцэрт.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Станіслаў Шушкевіч галадае...

4 чэрвеня Станіслаў Шушкевіч быў заўважаны на прыёме ў Мінску, які ладзіла амбасада Італіі. Станіслаў Станіслававіч нічога не еў, піў толькі ваду. Знаёмым ён прызнаўся, што зараз галадае і згубіў у вазе ўжо больш за 10 кілаграмаў.

— Нічога сенсацыйнага ў гэтым няма, — падрабязнасцямі галадання былы кіраўнік Беларусі дзяліўся неахвотна. — Час ад часу я галадаю. 18, 20, 21 дзень, у залежнасці ад настрою. Бывае і 40 дзён абыходжуся без ежы. Пасля галадання вельмі добра сябе адчуваю. У нас у сям'і так заведзена. Мы галадаем усе разам — я, сын, жонка...

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

ДОБРАЯ НАВІНА

Адумаліся?..

У Беларусі спынены шэраг крымінальных спраў, якія былі распачатыя ў адносінах да актывістаў дэмакратычнага руху. Пра гэта паведаміў вядомы грамадскі актывіст Вячаслаў Сіўчык.

Паводле яго слоў, спынены, у прыватнасці, крымінальныя справы ў адносінах да Дзяніса Дзянісава і Таццяны Яловай у Віцебску.

Дзяніс Дзянісаў быў арыштаваны 16 лютага. Пазней яму было прад'яўлена абвінавачанне па частцы 1 артыкула 342 (замах на арганізацыю масавых беспарадкаў). Следства лічыла Дзянісава арганізатарам па так званай справе БУНТу, калі 17—19 чэрвеня 2006 года на вышцы віцебскага амфітэатра маладзёжная актывістка Крысціна Шацікава вывесіла бел-чырвона-белы сцяг, а ў абласным цэнтры з'явіліся графіці "БУНТ". 11 красавіка Д.Дзянісаў быў адпушчаны пад залог. Таццяна Яловая таксама праходзіла па гэтай справе.

Апрача таго, паводле слоў В.Сіўчыка, спынена крымінальная справа ў дачыненні да маладзёжных актывістаў Мікіты Краснова, Аляксандра Урыўскага, Аляксандры Ясюк і Наталлі Старасцінай.

Гэтыя крымінальныя справы былі распачатыя напярэдадні Дня Волі 25 сакавіка. Актывісты дэмакратычных рухаў былі абвінавачаныя ў арганізацыі групавых дзеянняў, якія парушаюць грамадскі парадак, або ўдзеле ў такіх дзеяннях. Варта зазначыць, што ўсіх іх затрымлівалі 22 сакавіка, яшчэ да правядзення акцыі.

Сяргей ПУЛЬША.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Скажыце, калі ласка, дык што за рух стварае Аляксандр Мілінкевіч? Памятаецца, некалі Аляксандр Казулін браўся за гэта. І што атрымалася? Нічога. Баюся, што і ў Мілінкевіча ўсё закончыцца пшыкам.

Я згодны з тымі, хто крытыкуе Мілінкевіча за яго пасіўнасць, нерашучасць падчас прэзідэнцкіх выбараў. Але ўсё ж цікава ведаць, які грамадскі рух ён хоча стварыць цяпер...

Барыс КАНДРАЦЬЕЎ, служачы.

За Свабоду...

Менавіта пад такой назвай узяўся ствараць шырокі грамадскі рух Аляксандр Мілінкевіч.

Асноўныя падыходы ўжо вызначаны.

Асноватворныя нацыянальныя каштоўнасці:

— Незалежнасць. Рэспубліка Беларусь — суверэнная незалежная дзяржава, Рэспубліка Беларусь валодае вяршынствам улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку.

— Свабода. Правы і свабоды, замацаваныя ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і асноўных свабод, з'яўляюцца фундаментальнымі нацыянальнымі каштоўнасцямі грамадзян Беларусі. Рэспубліка Беларусь праз сваё заканадаўства гарантуе права карыстання гэтымі свабодамі і правамі ўсім асобам на тэрыторыі Беларусі.

— Дэмакратыя і вяршынства закона. Прыхільнасць Беларусі асноватворным дэмакратычным каштоўнасцям і прынцыпам кіравання, характэрная для кансалідаваных дэмакратычных сістэм, пацвярджаецца безумоўным падпарадкаваннем улады закону, падзелам улад на тры незалежныя галіны: заканадаўчую, выканаўчую і судовую, спрыяннем з боку ўлады развіццю інстытутаў грамадзянскай супольнасці і незалежнасці сродкаў масавай інфармацыі.

— Дабрабыт. Беларусь развівае эканоміку на рынкавых прынцыпах і праводзіць эфектыўную сацыяльную палітыку, накіраваную на павышэнне дабрабыту ўсіх грамадзян.

— Мір. Беларусь імкнецца ўсталяваць і падтрымліваць прыязныя дачыненні з усімі краінамі на падставе норм міжнароднага права.

— Бяспека. Беларусь робіць усе захады, каб гарантаваць бяспеку грамадзян, а таксама дзяржавы і яе інстытутаў на сваёй тэрыторыі. Робіць захады па абароне сваіх грамадзян за межамі Беларусі.

У дакуменце ў раздзеле "Пагрозы і выклікі нацыянальнай бяспекі" асобны пункт тычыцца расійскіх ваенных баз.

"Беларусь ставіцца да наяўнасці на яе тэрыторыі дзвюх расійскіх вайсковых баз як да цяжка аддзяляльнага фрагменту былой агульнай сістэмы абароны ў межах былой агульнай дзяржавы — СССР і ўсведамляе цяжкасці і памеры выдаткаў па змяшчэнні гэтых баз на тэрыторыі Расіі. Беларусь не патрабуе неадкладнага вываду гэтых баз, але настойвае на неадкладных перамовах па гэтым пытанні і на дакладным вызначэнні статусу баз, справядлівым памеры аплаты за іх размяшчэнне і дакладнага вызначэння тэрміну іх канчатковага вываду з тэрыторыі Беларусі як дзяржавы, што імкнецца да нейтралітэту".

Рух Мілінкевіча названы праеўрапейскім. І сапраўды, у ліку галоўных мэт — інтэграцыя з Еўрасаюзам.

"Гістарычна, геаграфічна, палітычна і культурна Беларусь была і застаецца часткай Еўропы, яна мяжуе з трыма краінамі — членамі ЕС і з Украінай, якая афіцыйна аб'явіла пра сваё імкненне стаць сябрам ЕС. Прыналежнасць да сям'і роўных еўрапейскіх нацый, увядзенне стандартаў ЕС па дэмакратычным развіцці, жыццезабеспячэнні, ахове здароўя, абароне навакольнага асяроддзя і іншых найважнейшых паказчыках чалавечага вымярэння — годная мэта для незалежнай Беларусі.

5.4. Партнёрства з РФ. Дачыненні Беларусі і Расіі будуць развівацца на раўнапраўнай рынкавай аснове. Супрацоўніцтва з Расіяй павінна развівацца ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці, выключаючы пазіцыі, што абмяжоўваюць дзяржаўны суверэнітэт Беларусі.

5.5. Партнёрства з НАТО. Як нейтральная дзяржава Беларусь развівае партнёрскія дачыненні з НАТО — арганізацыяй, якая з'яўляецца найбольш эфектыўнай сістэмай калектыўнай бяспекі ў Еўропе і свеце.

5.6. Партнёрства і супрацоўніцтва з краінамі СНД.

... Удзел Беларусі ў АДКБ не адпавядае нацыянальным інтарэсам. Пры гэтым Беларусь зацікаўлена ў падтрыманні сталага двухбаковага дыялогу з краінамі — членамі АДКБ па пытаннях міжнароднай бяспекі, што выклікаюць узаемны інтарэс.

5.7. Шматбаковае супрацоўніцтва.

... Удзел Беларусі ў Руху недалучэння не адпавядае беларускім нацыянальным інтарэсам".

АФІЦЫЙНА

Дзецям да сямі гадоў ільготу на праезд пакінулі

Дзецям да сямі гадоў захоўваецца бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога транспарту. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміла намеснік старшыні пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльным развіцці Ала Ралькевіч.

Паводле яе слоў, законапраект аб упарадкаванні льгот, які прыняты абедзвюма палатамі парламента, захоўвае асноўныя льготы, што прадугледжаны дзецям да 18 гадоў. Апрача бясплатнага праезду ў гарадскім пасажырскім транспарце, дзецям да сямі гадоў захоўваецца бясплатны праезд у пасажырскіх цягніках і вагонах фарміравання Беларускай чыгункі. Таксама захоўваецца праезд дзецям з аплатай па льготным тарыфе.

Захоўваецца бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне дзяцей па заключэнні лячэбна-кансультацыйнай камісіі, а таксама санаторна-курортнае лячэнне з аплатай пуцёўкі ў памеры 15 працэнтаў яе кошту. Апрача таго, захоўваецца бясплатны праезд ад месца жыхарства да месца навучання і назад у пасажырскіх цягніках і вагонах фарміравання Беларускай чыгункі для дзяцей, якія пражываюць у сельскай мясцовасці і вучацца ва ўстановах адукацыі, што забяспечваюць атрыманне агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі. Апрача таго, поўнасцю захоўваюцца льготы дзецям-інвалідам на праезд практычна на ўсіх відах транспарту, паведаміла А.Ралькевіч.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ГРОМКИЕ ДЕЛА

Полмиллиона долларов за...что?

На минувшей неделе накануне очередной коллегии генпрокурор Беларуси Петр Миклашевич рассказал о некоторых уголовных делах, связанных с крупными взятками.

Судебные исполнители ждут суда

— Мы приняли к производству уголовное дело в отношении судебных исполнителей Хозяйственного суда Минска по фактам взяточничества, — *сообщил Миклашевич.* — Они обвиняются в том, что с целью получения незаконного материального вознаграждения стали вымогать у представителя коммерческой фирмы взятку в сумме ***170 тысяч долларов***. За это они обещали оказать содействие в одержании победы при проведении торгов по продаже недвижимости РУП "Завод точного машиностроения "Планар". При получении ***85 тысяч долларов*** оба задержаны. Проводится расследование.

Вина доказана

— Недавно было закончено и направлено в суд уголовное дело в отношении первого заместителя председателя Крупского райисполкома Минской области Синяка, — *сказал генпрокурор.* — Он обвиняется в совершении злоупотреблений служебными полномочиями, а также в покушении на получение взятки. В ходе расследования установлено, что он за оказание содействия благоприятного решения вопроса по продаже незавершенного строительства завода керамических изделий, расположенного в Крупском районе, вымогал взятку у представителя коммерческой фирмы в размере ***212 тысяч долларов***. При получении примерно 5300 долларов он был задержан. Его вина по этим фактам доказана, дело направлено в суд.

Особо крупный размер

Завершается расследование дела в отношении заместителя председателя центрального правления общественного объединения "Белорусское общество инвалидов" Гапеева. Ему предъявлено обвинение в том, что он, злоупотребляя своими служебными полномочиями, предпринял ряд мер, чтобы вышеназванный объект был реализован по заниженной цене. И в феврале при получении взятки размером ***530 тысяч долларов*** он был задержан работниками правоохранительных органов. Расследование дела завершается, скоро оно будет направлено в суд.

Прерванный полет

— На уровне республиканской прокуратуры продолжается расследование уголовного дела в отношении начальника смены грузового комплекса РУП "Национальный аэропорт "Минск" Носкова и других сотрудников аэропорта, которые с руководителями ряда коммерческих структур пытались незаконно вывезти за пределы нашей страны шкурки меха норки на сумму около 2,5 миллиарда долларов.

Фото photo.bymedia.net

МНЕНИЕ ЭКСПЕРТА

*Размер вымогаемых взяток поражает своей "скромностью". Известный экономист **Ярослав Романчук** считает, что по размеру взяток можно судить о благосостоянии чиновников.*

— Размер взяток зависит от тех ресурсов, которыми управляют чиновники и так называемые политические предприниматели, — *высказывает свое мнение Романчук.* — Темпы роста и размера взяток в десятки раз превышают темпы роста и размеры реальной заработной платы, пенсий. Те, кто вымогает взятки, хорошо осведомлены о том, сколько денег работает в той или иной сфере экономики, поэтому они "поднимали планку". Если бы взяточники были уверены в том, что это абсолютно неподъемная цифра, то, конечно, сумма взяток была бы иной. При упоминании истинных размеров взяток миф о бедности белорусских номенклатурщиков развеивается.

Стоит отметить, что взятки в России, Украине, Евросоюзе значительно выше, чем у нас. Так что названные генпрокурором суммы — это просто рыночная адаптация аппетитов наших чиновников к условиям работы, в том числе с бюджетными деньгами, которые мы все эти годы задарма получали из России.

Все эти взятки еще раз подтверждают вывод, который недавно сделал Transparency International: в ежегодном международном рейтинге государств по уровню коррупции Беларусь занимает 151-е место из 163. По сути дела, за последние пять лет Беларусь из относительно благополучной страны превратилась в страну с повсеместной, всепожирающей коррупцией.

Выход один — систему менять надо...

Марина КОКТЫШ.

Кстати

С 1 июня в соответствии с новым Законом о прокуратуре в Беларуси появилась Генеральная прокуратура.

На здании бывшей республиканской прокуратуры уже несколько недель висит новая вывеска.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Цімафей ДРАНЧУК: «Трэба разумець, што акрамя палітзняволеных у турмах трэба абараняць і простых людзей»

Наша газета ўжо праінфармавала чытачоў аб тым, што ў Беларусі сфарміраваны аргкамітэт па стварэнні новай грамадскай арганізацыі — камітэта ў абарону правоў зняволеных "Над бар'ерам".

Больш падрабязна аб гэтым на пытанні карэспандэнта "Народнай волі" адказвае адзін з членаў аргкамітэта, былы палітзняволены **Цімафей ДРАНЧУК**.

— Цімафей, галоўным прыярытэтам сваёй работы Вы вызначылі прыцягненне грамадскай думкі да праблем зняволеных...

— Разумееце, паўплываць на змяненне сітуацыі ў калоніях у нашай краіне практычна немагчыма, бо сістэма стваралася гадамі. Аднак цягам таго часу, калі я быў спачатку ў "амерыканцы", а затым на "валадарцы", я сустракаўся з многімі людзьмі, якія злачынцамі не абавязкова і з'яўляюцца, а калі з'яўляюцца, то не на "такія тэрміны". Той жа ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч, яшчэ шэраг зняволеных... Я чытаў крымінальныя справы многіх людзей, вінаватасць якіх абсалютна недаказальная. І вось гэтыя людзі за кратамі сваю невінаватасць абсалютна не могуць адстойваць, таму што за любую актыўнасць у той жа калоніі №1, дзе я адбываў пакаранне, могуць пасадзіць на 15 сутак у ШЫЗА і тым самым сапсаваць усё здароўе чалавеку. Зараз я кантактую з многімі люзьмі, якія знаходзяцца ў няволі, і яны ўвесь час скардзяцца. Чыюсьці скаргу проста не "выпусцілі" з калоніі, нехта распавядае, што яго ні за што ні пра што змясцілі ў штрафны ізалятар. Адзін з маіх знаёмых, які ўжо два з паловай гады знаходзіцца ў "адзінцы" (дарэчы, афіцэр спецпадраздзялення "Альфа"), распавёў, напрыклад, што яго не выпускаюць умоўна-датэрмінова толькі таму, што ён адмовіўся даваць работніку калоніі хабар у памеры 2 тысячы долараў. Знайшлі "забароненыя рэчы" — шорты...

— І чым ваша арганізацыя зможа дапамагчы, скажам, гэтаму чалавеку?

— Па-першае, мы паспрабуем па максімуме распаўсюдзіць інфармацыю ў прэсе аб парушэнні. Па-другое, можам дапамагчы яго родным падрыхтаваць у адпаведныя інстанцыі заявы. У наш аргкамітэт уваходзяць людзі з юрыдычнай адукацыяй, з цягам часу будзем прыцягваць больш кампетэнтных людзей.

— Цімафей, а якім чынам Вы збіраецеся наладжваць кантакты са зняволенымі, якія знаходзяцца за кратамі?

— У нас ёсць такая магчымасць, і скажу вам, што ў калоніях ужо ведаюць аб тым, што такая арганізацыя ствараецца. Акрамя ўсяго іншага, яшчэ раней я кантактаваў з роднымі зняволеных. І, натуральна, кожны чалавек, блізкія якога патрапілі за краты, зможа прыйсці да нас і папрасіць дапамогі. Зараз у нас у краіне амаль усе праваабарончыя арганізацыі займаюцца палітзняволенымі, а вось такіх, якіх хваляваў бы лёс простага зняволенага, — няма.

— Не так даўно пры Міністэрстве юстыцыі быў створаны грамадскі савет па наглядзе за турмамі. Вы чулі што-небудзь пра яго?

— Скажу шчыра — зусім нічога. І слаба прадстаўляю дзейнасць такой арганізацыі, бо, наколькі ведаю па ўласным вопыце, ніякі савет не зможа пракантраляваць дзейнасць адміністрацый калоній. Нашая ж мэта — не раскруціць праблему зняволеных да нейкіх памераў, а вырашыць яе. З палітзняволенымі ўсё адбываецца наадварот.

— Рэгістравацца вы збіраецеся ў Літве?

— Так, аднак ужо затым будзем спрабаваць атрымаць акрэдытацыю ў Беларусі як замежная арганізацыя. Магчымы варыянт і спробы паралельна зарэгістравацца ў Беларусі, хоць у гэта слаба верыцца. Сам факт таго, што пры Міністэрстве юстыцыі прыбралі ўпраўленне па грамадскіх аб'яднаннях, сведчыць аб тым, што шанц зарэгістравацца тут вельмі малы.

P.S. Дасылаць лісты ў аргкамітэт можна па адрасе: 220050 г.Мінск, а/с 191.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДАРЭЧЫ

Чаму ў Беларусі так многа злачынцаў?

Беларусь мае адзін з самых высокіх паказчыкаў у Еўропе па колькасці зняволеных, займаючы другое месца пасля Расіі. У нашай краіне 426 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, у Расіі — 623 чалавекі. Такія даныя апошніх даследаванняў Міжнароднага цэнтра вывучэння турмаў пры лонданскім King's College.

Аналізуючы стан папраўчых устаноў на постсавецкай прасторы, эксперты адзначаюць высокую перанаселенасць турмаў, іх надзвычай нізкі санітарны ўзровень, праблему недастатковай бяспекі вязняў, уключаючы фізічны гвалт і сексуальныя напады.

Пасольствы Рэспублікі Беларусь дзейнічаюць у многіх краінах свету. Іх узначальваюць вопытныя дыпламаты. Хацелася б ведаць, як іх праца аплачваецца нашай дзяржавай?

Максім НОВІКАЎ, студэнт.

Які заробак у беларускіх паслоў?

Заробкі беларускіх паслоў знаходзяцца ў залежнасці ад таго, у якіх краінах яны працуюць. Так, да краін з *"цяжкімі кліматычнымі ўмовамі"* адносяцца В'етнам, Ірак, Індыя, Пакістан, Арабскія Эміраты... Кіраўнікі нашых прадстаўніцтваў у гэтых і іншых краінах маюць права на надбаўку да аплаты ў памеры 10 працэнтаў. А калі яны працуюць па сумяшчальніцтве яшчэ і ў суседніх краінах, то ім налічваецца яшчэ 10-працэнтная надбаўка.

Шэраг беларускіх паслоў маюць месячны заробак у памеры больш за 3000 еўра. Але так аплачваецца праца не ўсіх амбасадараў. Наш пасол у Францыі зарабляе ў месяц недзе каля 3000 еўра.

Самыя нізкія заробкі нашых паслоў у Азербайджане, Туркменіі, Узбекістане, Кыргызстане, Арменіі — 2100 долараў. Але ж там і цэны на прадукты харчавання і тавары масавага попыту не такія высокія, як у іншых краінах.

Заўважым: калі жонка пасла не працуе, яна мае права на атрыманне 20 працэнтаў ад заробку мужа. Калі ў іх ёсць дзеці, то за кожнае дзіця выплачваецца яшчэ па 5 працэнтаў ад акладу пасла.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Кастусь СЕВЯРЫНЕЦ:

«Ніякай просьбы аб памілаванні Паўла мы не пісалі, бо нам не трэба літасці ад улады, якая нізавошта зняволіла нашага сына!»

Ведаючы, як нецярпліва чакалі вызвалення Паўла Севярынца яго бацька і маці, я неадкладна патэлефанаваў даўняму свайму сябру і калегу па журналістыцы Кастусю Севярынцу, каб павіншаваць яго з радаснай падзеяй. Але, надзіва, ён не выказаў радасці. Насупраць, у голасе Канстанціна Паўлавіча чулася горыч...

— Зразумела, я задаволены, што скончыўся, нарэшце, "лесапавальны" перыяд жыцця сына, — сказаў бацька Паўла. — Але чым больш я думаю пра гэтае раптоўнае вызваленне, тым больш знаходжу ў ім нешта абразлівае. Ад яго патыхае правакацыяй. Паўлу заставалася каля двух месяцаў, каб поўнасцю адбыць прысуджаны яму тэрмін і выйсці на волю, так бы мовіць, учыстую. Гэтага мы з жонкай чакалі і, дачакаўшыся, сапраўды былі б шчаслівыя. Цяпер жа вызваленне мае фармулёўку *"ўмоўна-датэрміновае за прыкладныя паводзіны"*. Для мяне тут няма логікі, бо пытанне аб такім, умоўна-датэрміновым, вызваленні сына ўжо шмат разглядалася адпаведнымі службоўцамі, але кожны раз Паўлу адмаўлялі, спасылаючыся на тое, што ён, маўляў, *"не ўстаў на шлях выпраўлення"*. А каб "стаць" на такі шлях, сыну неабходна было падпісаць паперу з раскаяннем у тым, за што яго судзілі. Павел, зразумела, не хацеў гэта рабіць, бо калі б зрабіў, то відавочна прызнаў бы сябе вінаватым. А ён вінаватым сябе не лічыў і не лічыць. Дарэчы, улада, якая нізавошта адправіла майго сына на лесапараспрацоўкі, вызваліўшы яго цяпер, свой жа закон і парушыла, бо атрымалася, што Павел вызвалены ўмоўна-датэрмінова без пакаяннай заявы. Дзіўна ўсё гэта... Але як бы там ні было, я ўдзячны кожнаму, хто шчыра, без "задняй думкі", спрычыніўся да сынава вызвалення. Ад усёй душы дзякую сотням цудоўных людзей, суайчыннікам і замежнікам, якія ўвесь час зняволення Паўла падтрымлівалі яго і нас з жонкай лістамі, сардэчнымі словамі. Мы з жонкай Таццянай ніколі не забудзем увагі і дапамогі з боку газеты "Народная воля", у якой, дзякуючы пазіцыі галоўнага рэдактара, рэгулярна друкаваліся матэрыялы ў падтрымку Паўла. Тым больш я здзівіўся, калі ў гэтай паважанай газеце з'явіўся артыкул нейкага Глеба Хмяльніцкага, які з чужога, відаць, голасу паведаміў, што Паўла Севярынца выпусцілі на волю таму, што ягоныя сямейнікі напісалі заяву ў камісію па памілаванні.

Заяўляю цвёрда: ніякай просьбы аб памілаванні мы не пісалі, бо нам не трэба літасці ад улады, якая нізавошта зняволіла нашага сына, а потым неаднаразова стварала правакацыі, каб зрабіць з яго крымінальнага злачынцу і замяніць тэрмін зняволення на больш працяглы і цяжкі.

Паўтару: мне было б лягчэй, калі б сын адбыў у няволі яшчэ два належныя месяцы і выйшаў бы на свабоду без агаворак і ўмоў.

— А як ты, Косця, ставішся да інфармацыі пра тое, што датэрміновае вызваленне Паўла ды іншых палітвязняў — вынік уціску на беларускую ўладу з боку ЗША і Еўрапейскага Саюза, якія пагражалі рэжыму Лукашэнкі эканамічнымі санкцыямі?

— Я знаходжуся далекавата ад высокай палітычнай "кухні". Але ўсё ж лічу, што не ў санкцыях справа, а ў тым, што ўладам чамусьці спатрэбілася выпусціць Міколу Статкевіча і Паўла Севярынца якраз напярэдадні Кангрэса дэмакратычных сіл. Дапускаю, што, вызваліўшы адных, але не даўшы волі іншым, улада планавала раз'яднаць апазіцыю, яшчэ глыбей раскалоць яе шэрагі.

— Ці не баішся ты, што Павел, атрымаўшы свабоду, адразу ж ізноў возьме ўдзел у якой-небудзь гучнай палітычнай акцыі і зноў апынецца на лаўцы падсудных?

— Лічу, што бліжэйшым часам ён гэтага не будзе рабіць. Так, наш сын — смелы чалавек, але ж не вар'ят. Ён выдатна разумее, што, знаходзячыся ў статусе ўмоўна вызваленага, рызыкуе трапіць пад суд і за краты за любую дробязь, любое неасцярожнае слова, любы неабачлівы рух. Да таго ж ён ведае, як у Віцебску адыгралася ўлада на ягонай маці за перакананні сына.

— У недзяржаўным друку паведамлялася аб незаконным звальненні тваёй жонкі. Я чуў, што ты робіш спробу дамагчыся справядлівасці праз суд...

— Гэта праўда, суд будзе, і я вельмі спадзяюся, што перамога дастанецца нам. Дзе ж гэта бачна — выкінуць са школы адну з лепшых настаўніц горада, педагога амаль з 40-гадовым стажам, маці траіх дзяцей? Таню звольнілі без прычыны, толькі за тое, што яна мае дачыненне да нязручнага для ўлады палітыка, сама спачувае дэмакратычнаму руху і "мела нахабства" аднойчы вылучыцца кандыдатам у дэпутаты раённага Савета. Не, я гэтага ўладзе не дарую! Я павінен зрабіць усё, каб Таццяну аднавілі на працы ў адпаведнасці з існуючым законам. Сёння гэта для мяне — самае галоўнае, важнейшае нават за нечаканае вызваленне сына.

— Іншымі словамі, спакой табе толькі сніцца?

— Нават і не сніцца, бо які можа быць сон у такіх акалічнасцях...

Гутарыў Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

Даходы чыноўнікаў павялічыліся, пенсіянераў — зменшыліся

Гэта, відаць, і ёсць сутнасць так званай *“беларускай мадэлі эканамічнага развіцця”*.

Сродкі масавай інфармацыі раней паведамлялі аб павышэнні зарплат чыноўнікаў і дэпутатаў на пачатку гэтага года. Яны сталі атрымліваць у месяц прыкладна на сто долараў болей. А іх жа заробкі — за мільён рублёў, а то і два мільёны. Затым былі павялічаны каэфіцыенты, а значыць, і заробкі кіраўнікам і спецыялістам прадпрыемстваў.

А днямі першы віцэ-прэм’ер Уладзімір Сямашка падчас справаздачы ўрада парламенту заявіў аб неабходнасці больш важкіх сацыяльных гарантый дырэктарскаму корпусу. Ён, у прыватнасці, нагадаў, што нядаўна быў павялічаны да 4,5 павышаючы каэфіцыент для кіраўнікоў прадпрыемстваў. У выніку зарплата дырэктара БМЗ складае каля 3 тысяч долараў у месяц. Па словах Сямашкі, цяпер урад разглядае магчымасць павелічэння гэтага каэфіцыента да 5,5.

Вядома ж, далёка не ва ўсіх дырэктараў заводаў такія высокія заробкі, як у кіраўніка Беларускага металургічнага завода. Але, як бачым, чыноўнікам і дэпутатам зарплату ўсё ж павышаюць. А вось пра пенсіянераў забыліся. Летась да гэтага часу двойчы павялічвалі пенсіі — з 1 студзеня і 1 мая. А вось сёлета штосьці не чуваць аб іх павышэнні. Між тым сярэдняя пенсія складае каля 300 тысяч рублёў. А цэны ж растуць пастаянна. Днямі прынята рашэнне аб скасаванні шэрагу льгот. У прыватнасці, ветэраны працы пазбаўляюцца 50-працэнтнага кошту праезду на пасажырскім транспарце. Гэта моцны ўдар па іхнім бюджэце.

Дарэчы, такая льгота для ветэранаў не выпадковая. Усе ведаюць, што пенсіі ў іх маленькія, вось і ўвялі ў свой час як даплату да яе гэты 50-працэнты кошт праезду на транспарце. Гэта была адчувальная падтрымка для дачнікаў.

Тут варта нагадаць, што дача для ветэранаў — выратаванне ў цяжкай сённяшняй жыццёвай сітуацыі. Гэта і мех бульбы, кілаграмы яблык і соку, рознай агародніны. Гэта добрая падтрымка для пенсійнага бюджэту. Ды і чалавек, корпаючыся на зямлі, заняты добрай справай, якая мацуе здароўе і ўзнімае настрой.

А што будзе цяпер, пасля скасавання гэтай ільготы? Для многіх паездкі на дачы стануць не па кішэні. Давайце падлічым. Дабрацца нават да блізкай дачы цяпер каштуе дорага. Возьмем, напрыклад, дачы Сёмушкі, што пад самым Мінскам каля вёскі Чучаны. Сюды ад кальцавой мінскай дарогі кіламетраў дзесяць. А вось праезд з аўтастанцыі “Маскоўская” каштуе 2 тысячы 80 рублёў. Туды і сюды — 4 тысячы 160 рублёў. Ды каб дабрацца на аўтастанцыю і ад яе дадому трэба як мінімум тысяча. Усяго значыць 5160 рублёў. Гэта аднаму. А з жонкай, бо ездзяць на дачу абодва ветэраны — 10.320 рублёў. І гэта столькі трэба грошай на адзін дзень. А на дачу трэба ж ездзіць улетку як мінімум разы два на тыдзень. Значыць, на адны паездкі трэба ў месяц патраціць 83 тысячы рублёў. І гэта з мізэрных пенсій

СМІ цытуюць словы першага віцэ-прэм’ера аб тым, што ён, як былы дырэктар, лічыць абсалютнай несправядлівасцю тое, што пасля выхаду на пенсію дырэктар прыраўноўваецца да таго, хто працаваў не вельмі напружана. Дырэктары, падкрэсліваецца, працуюць жа па 12—16 гадзін у суткі.

Канечне, дырэктарскі хлеб нялёгкі. Але ці на многа ён лягчэйшы ў хірурга, настаўніка, вучонага, даяркі? І яны нярэдка працуюць вечарамі і начамі. Хто пра іх патурбуецца? Няўжо трэба чакаць, калі віцэ-прэм’ерамі стануць хірургі, даяркі, пенсіянеры?

Да таго ж дырэктары бываюць розныя — тыя, што выводзяць калектывы да прагрэсу, і тыя, што завальваюць справу. Як, дарэчы, розныя бываюць і хірургі, і даяркі. І таму, думаецца, куды справядлівей было б, каб сума пенсіі вызначалася ад укладу чалавека ў развіццё калектыва, галіны, дзе ён працуе, незалежна ад таго, кім — дырэктарам, дзяржслужачым ці даяркай.

Думаецца, улада болей не можа адмоўчвацца. Яна павінна сказаць — калі і наколькі вырастуць пенсіі. Ці яна будзе павышаць даходы толькі сваім чыноўнікам?

Яўген ТАЎГЕНЬ.
Фота photo.bymedia.net

Купили бриллиант?

С середины декабря 2005 года по 4 июня 2007 года Национальный банк Беларуси продал населению 1286 бриллиантов общей массой 236,51 карата на сумму порядка 427 тыс. долларов США в эквиваленте. В том числе в мае этого года население купило бриллиантов на 42 тыс. долларов. Такие данные БелаПАН сообщил пресс-секретарь Нацбанка Михаил Журавович.

Машина подземелья

На Могилевском автомобильном заводе (филиале РУП “БелАЗ”) создано универсальное транспортное средство для подземных работ в шахтах и рудниках. Грузоподъемность машины 5 т. Повышена ее маневренность и проходимость в стесненных условиях шахт и рудников. До конца года планируется провести ее заводские, а затем эксплуатационные испытания на одной из шахт Российской Федерации либо Казахстана, куда предполагается экспортировать новую технику.

КТО ПРАВ?

Разошлись во мнениях

Премьер-министр Беларуси Сергей Сидорский оценил итоги прошедшего в Ялте заседания Совета глав правительств стран — участниц СНГ как продуктивные.

По его словам, принятие соглашения о создании единого энергетического рынка стран СНГ стало главным документом на заседании совета. Говоря о том, какие выгоды для Беларуси несет это соглашение, Сергей Сидорский сказал: *“Прежде всего мы явно выходим на понимание общего энергетического рынка, где энергетический продукт будет формироваться на условиях функционирования единого рынка СНГ”. “Примечательно, что наши белорусские предприятия смогут участвовать в странах СНГ по реформированию энергетических мощностей. Это очень важный документ”*, — добавил он.

Подписание соглашения о формировании общего электроэнергетического рынка СНГ — это серьезный шаг по углублению сотрудничества в рамках Содружества. Об этом заявил председатель правительства России Михаил Фрадков, подводя итоги заседания Совета глав правительств СНГ в Ялте. *“Мы сочли целесообразным выйти на подписание этого соглашения и считаем, что это полезный договор, расширяющий возможности торговли электричеством, создающий условия по обеспечению равного доступа стран СНГ к энергоресурсам”*, — отметил он.

Свои подписи под документом поставили представители России, Казахстана, Беларуси, Киргизии, Армении и Таджикистана.

ДРУГОЙ ВЗГЛЯД

Остальные шесть стран СНГ отказались одобрять документ, сообщает “Коммерсант”. Они аргументировали свое решение тем, что единая электросеть создается в интересах России и на невыгодных для них условиях. Не одобрили соглашение Азербайджан, Туркмения, Узбекистан, Грузия, Молдавия и Украина.

МАЛЫЙ БИЗНЕС

Застой

В чем его опасность?

Что же представляет собой наш малый бизнес? Какой вклад он вносит в развитие экономики?

На днях на эту тему обнародованы важные цифры и факты.

По данным Министерства статистики и анализа Беларуси, по состоянию на 1 января 2007 г. количество малых предприятий составило 37.660. По сравнению с 2005 годом их число увеличилось на 4566 предприятий, или на 13,8%. Из всего количества малых предприятий 2022 — крестьянские (фермерские) хозяйства, которые до 2006 года не попадали под обследование как субъекты малого предпринимательства.

Численность работников малых предприятий составила 478.988 человек, что на 22808 человек, или на 5%, больше, чем в 2005 году. Всего в сфере малого бизнеса (с учетом индивидуальных предпринимателей) по итогам 2006 года занято 670,8 тыс. человек, что составляет 15,4% от занятых в экономике.

Удельный вес валового внутреннего продукта, произведенного субъектами малого предпринимательства, составил 8,8% (в 2005 году — 8,1%) от общего объема ВВП. Субъектами малого предпринимательства произведено 8,1% (7,6%) от общего объема выпуска товаров и услуг; 7,5% (7,0%) от общего объема производства продукции (работ, услуг промышленного характера); 10,2% (10,1%) от общего объема розничного товарооборота, включая общественное питание; 23,9% (в 2005 году — 21,3%) от общего объема внешнеторгового оборота. Доля малого предпринимательства в общем объеме выручки от реализации товаров, продукции, работ и услуг по народному хозяйству за 2006 год составила 22,8% (в 2005 году — 21,2%).

Отраслевая структура малого предпринимательства неоднородна. Наибольшее количество малых предприятий занято в торговле и общественном питании — 39,1%. В промышленности сосредоточено 22,3%, строительстве — 11,7%, сельском хозяйстве (включая крестьянские (фермерские) хозяйства) — 6,1%, транспорте — 5,1% от общего количества малых предприятий. По численности занятых на малых предприятиях лидируют промышленные предприятия — 37,1% от общего количества занятых на малых предприятиях. На предприятиях торговли и общественного питания занято 25,1%, в строительстве — 16,3%

Из множества цифр обратим внимание на две. Как сказано выше, всего в сфере малого бизнеса (с учетом индивидуальных предпринимателей) по итогам 2006 года занято 670,8 тыс. человек, что составляет 15,4% от занятых в экономике. А доля малого предпринимательства в общем объеме выручки от реализации товаров, продукции, работ и услуг по народному хозяйству за 2006 год составила 22,8% (в 2005 году — 21,2%). Обратите внимание — занято в малом бизнесе лишь 15,4% работающих, а доля выручки страны аж 22,8%. Простые расчеты показывают, что если бы в малом бизнесе у нас трудилось чуть больше половины работающих, то выручка в стране почти удвоилась бы.

Именно поэтому ведущие страны мира создали благоприятные условия для развития малого бизнеса. В Швеции, Германии, США в нем занято до половины работающих, и они производят 55—65 процентов валового внутреннего продукта (ВВП). Число малых и средних предприятий на тысячу человек в Украине составляет 5, России — 6, Польше — 22, США — 74, Европейском Союзе — 45, в Беларуси — 3,3.

Малый бизнес в странах мира

Страна	Кол-во предпр. (тыс.)	Кол-во занятых (млн чел.)	Доля малого бизнеса в ВВП (в %)
Германия	2290	18,5	50—52
Италия	3920	17	57—60
США	7300	74	50—52
Япония	6500	40	55
Франция	-	15	55—62
Россия	ок. 1000	-	13,5
Украина	-	-	11
Беларусь	**37,6**	**0,670**	**8,8**

Эти данные приблизительные и округленные. Тем не менее они дают ясную картину о роли малого бизнеса у нас и в передовых странах. Именно благодаря малому бизнесу многие государства достигли впечатляющих результатов в развитии экономики. У нас же только говорят о необходимости создания благоприятных условий для предпринимателей, но очень мало делается для этого. И как результат — очень слабый рост малого бизнеса в стране. Внимательно посмотрите на таблицу.

Малый бизнес в Беларуси

	1997 г.	1999 г.	2000 г.	2002 г.	2006 г.
Количество малых предприятий (тыс.)	22,3	26,8	25,7	24,6	37,6
Их доля в ВВП (%)	4,8	6,8	6,7	6,6	8,8
Занятость в малом бизнесе (тыс.)	232,1	326,9	291,5	285,2	670,8
Занятость в малом бизнесе (%) к общей занятости	5,3	7,4	6,6	7,4	15,4

Как видим, все цифры в колонках словно застыли на одном месте. Небольшой рост отмечен лишь в прошлом году по сравнению с 2002-м. На этот рост повлиял и такой фактор, как прибавление к статистике фермерских хозяйств, которые “до 2006 года не попадали под обследование как субъекты малого предпринимательства”.

В общем, в малом бизнесе страны практически застой. Заметного движения вперед не наблюдается. А застой — довольно опасное явление. Падение, пусть и болезненное, требует кардинальных мер. И рано или поздно их предпринимают, и со временем начинается движение вперед. А застой может длиться долго, к тому же он, как болото, засасывает, негативно влияет на настроение и души предпринимателей, порождает у них и чиновников пассивность и безразличие. Те же, кто поактивнее, покидают это затхлое пространство и разворачивают свой бизнес в других краях, где атмосфера более благополучная. Они уезжают из этого болота, чтобы не возвращаться сюда никогда. Уезжают наиболее активные и подготовленные. Вот в чем вредность застоя.

Причина этого тревожного явления известная: отсутствие понимания роли малого бизнеса и как следствие — отсутствие поддержки. Но почему это происходит? Может, читатели ответят на этот вопрос?

Алесь ДРАБЧУК.

«Адабрамсу» не адбылося

Нафтавікі не падтрымалі распрацоўшчыкаў праекта новага закона аб прафесійным пенсійным страхаванні

Сустрэча прафсаюзнага актыву буйных прадпрыемстваў канцэрна “Белнафтахім” з прадстаўнікамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — распрацоўшчыкамі праекта згаданага закона адбылася днямі ў Наваполацку. У ёй бралі ўдзел працаўнікі полацкіх і нафтаполацкіх прадпрыемстваў нафтахіміі — ВА “Шкловалакно”, “Нафтана”, завода БВК, упраўленне “Нафтазаводмантаж” і іншых.

Яшчэ да сустрэчы нафтахімікі былі ў курсе чарговага “вынаходства” ўрадавых законатворцаў і разумелі, што яно, як і закон аб ільготах, прадыктаванае адной мэтай — папоўніць казну за кошт абмежавання сацыяльных гарантый грамадзян. У выпадку з нафтахімікамі, як яны лічаць, гэта недапушчальна, бо гаворка ідзе пра людзей, якія працуюць у надзвычай цяжкіх умовах.

Хутчэй за ўсё госці спадзяваліся, што пераканаюць нафтахімікаў у правільнасці законапраекта і знімуць напружанне, выкліканае гэтым нарматыўным актам.

Аднак чаканага “адабрамсу” не атрымалася. Нафтахімікі не сталі пляскаць у далоні, бо ўцямілі, што закон аб пенсіях пазбаўляе іх заслужаных прывілей і правоў.

Яны ўпэўнены, што чалавек, які ў цяжкіх умовах выпрацаваў дастатковы для пенсіі стаж, мае права і пенсію атрымліваць, і працягваць працаваць на вытворчасці, атрымліваючы зарплату. Новы ж закон прадугледжвае адняць у іх гэтае права — з яго выцякае: альбо пенсія, альбо зарплата.

Нафтахімікі лічаць такі падыход несправядлівасцю. Праўда, яны ў час сустрэчы не націскалі на свае, так бы мовіць, меркантыльныя інтарэсы. Яны слушна даводзілі, што ўмовы іх працы не лягчэй за працу вайскоўцаў і міліцыянераў, якія надзелены прывілеяй, што дазваляе ім атрымліваць і пенсію, і зарплату. А яшчэ яны гаварылі, што працаваць ім з кожным годам усё складаней і небяспечней. Старшыня прафкама АТ “Палімір” Анатоль Барэц прысвяціў сваю прамову самаму набалеламу пытанню — крытычнаму стану абсталявання, зношанага на “Паліміры” амаль на 60%. Грошай на ягонае адноўленне няма дзе ўзяць: інвестары ад прадпрыемства адхіснуліся, дзяржава, што раней дапамагала, апошнім часам таксама ў бок хімкамбіната не глядзіць. Праца ў гэткіх умовах робіцца настолькі цяжкай і небяспечнай, што без дасведчаных ветэранаў не абыдзешся.

Працаўнікі з непакоем гаварылі, што, выпіхвачы ветэранаў на пенсію, адміністрацыя прадпрыемстваў не турбуецца аб тым, хто будзе настаўляць моладзь. А калі ў адпаведнасці з новым, “удасканаленым” заканадаўствам у працуючых ветэранаў аднімуць зарплату або пенсію, яны сыдуць з вытворчасці і пакінутая без настаўнікаў моладзь наробіць памылак, якія немінуча прывядуць да сур’ёзных аварый, з-за чаго вытворчасць наогул забуксуе.

Нафтахімікі запатрабавалі, каб з закона аб прафесійным пенсійным страхаванні быў выкраслены пункт 3 артыкула 17, дзе ўтрымліваюцца захады, якія пазбаўляюць прывілей тых, хто выпрацаваў пенсійны стаж ва ўмовах шкоднай вытворчасці.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЧУЛІ?

Долары пад нагамі

Паводле звестак Мінтранса, даходы ад транзіту грузаў па Беларусі летась склалі 1,5 млрд долараў. Развіццё транспартна-лагістычных цэнтраў дазволіць павялічыць даходы.

Іх развіццё ў Беларусі будзе адбывацца за кошт прыцягнення замежных інвестараў. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі ў Мінску першы намеснік міністра транспарту і камунікацый Мікалай Верхавец.

Паводле яго слоў, мінімальны аб’ём інвестыцый для стварэння і развіцця такіх цэнтраў складзе 350—400 млн долараў. Гэтыя сродкі неабходны не толькі для будаўніцтва складоў і пад’язных шляхоў, але і для развіцця гасцінічнага сэрвісу і бізнес-структуры цэнтра, зазначыў М.Верхавец. *“Прамых інвестыцый з бюджэту рэспублікі ў гэтыя цэнтры, я думаю, не будзе”*, — сказаў ён.

“Мы можам прапанаваць схему, калі грузы з рэгіёнаў Азіі, прызначаныя еўрапейскім краінам, будуць пастаўляцца на самалётах грузапад’ёмнасцю 150—200 тон у беларускія лагістычныя цэнтры, і далей іх можна пастаўляць у Еўропу беларускім аўтатранспартам”, — сказаў М.Верхавец. Ён зазначыў, што, згодна з распрацаванай канцэпцыяй і праграмай развіцця транспартна-лагістычнай сістэмы ў Беларусі, плануецца пабудаваць цэнтры ў Мінскай вобласці (раён Нацыянальнага аэрапорта “Мінск”), у Брэсцкай і Віцебскай абласцях. Першы намеснік міністра паведаміў, што ў Мінтранс паступілі прапановы па інвестыцыях у мінскі транспартна-лагістычны цэнтр ад інвестараў з Бельгіі, ЗША і Расіі.

Паводле інфармацыі начальніка аддзела развіцця транспартнай дзейнасці і лагістыкі Сяргея Кучынскага, праграма развіцця транспартна-лагістычнай сістэмы Беларусі знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе. Плануецца, што восенню гэтага года яна будзе прынята і пачне дзейнічаць з 1 студзеня 2008 года. Паводле яго інфармацыі, транзітныя грузаперавозкі ў Беларусі ў 2006 годзе склалі 7,8 млн тон, што больш, чым перавозкі ва Украіне (1,6 млн тон) і Латвіі (2,5 млн тон).

Паводле звестак Мінтранса, даходы ад транзіту грузаў па Беларусі летась склалі 1,5 млрд долараў, пры гэтым каля 670 млн долараў было атрымана за кошт збораў і прадастаўлення паслуг замежным перавозчыкам.

Марына НОСАВА.

ОБРАТИТЕ ВНИМАНИЕ

Экономический успех там, где меньше всего социализма

Новое исследование знаменитого американского экономиста Грегори Кларка, профессора Калифорнийского университета, не дает особых поводов для надежд странам СНГ.

В своей книге “Прощайте, подаяния” он пытается доказать, что главный фактор экономического успеха страны, ее способности поднять уровень жизни людей — не вмешательство правительства и не качество рыночных институций, а работоспособность народа.

Преуспевающую страну от отсталой отличает производительность труда, которая закладывается, как считает профессор Кларк, столетиями культурных традиций. Без этого запаса страна скорее всего обречена на прозябание. По крайней мере, Кларк пророчит угасание многим странам третьего мира с растущим населением и неумением работать.

Для Радио Свобода его доводы прокомментировал **профессор Гуверовского института США, экономист Михаил БЕРНШТАМ:**

— Эта точка зрения основательна как частичное объяснение того, почему одни страны бедные, а другие страны богатые. Речь идет о качестве труда. Это — важнейший фактор экономического развития.

— Но именно это и доказывает автор книги, говоря о работоспособности как о главном двигателе преуспевания народа. Вы с этим не согласны?

— Дело в том, что умение работать, трудовые навыки очень быстро вырабатываются. Есть страны, которые вдруг совершали колоссальный бросок в будущее, — Тайвань, Гонконг, Сингапур и вот сейчас Китай. Китай был 30 лет назад одной из самых бедных стран мира с национальным доходом в мировых ценах 450 долларов на душу населения. Сейчас — уже свыше 7 тысяч долларов на душу населения в мировых ценах, то есть Китай перегнал большинство слаборазвитых стран и догоняет страны со средним доходом.

— Но Китай, по словам автора книги, как раз и отличается давней традицией готовности к труду?

— Невозможно условиями тысячелетней культуры объяснить вот такие вот колебания, когда Китай был первой страной в мире к 1500 году, стал одной из последних стран в мире к исходу XX века и вдруг уже в конце XX века поднялся. И предсказывают, что через 30—40 лет Китай опять будет самой успешной экономикой мира и едва ли не самой богатой. Действительно, низкая дисциплина, низкая мораль, плохое отношение к труду, низкая этика в обществе вообще — если все воруют, и никто не работает, — конечно, это обрекает экономику. Но каждая страна или почти каждая страна, если мы посмотрим на экономическую историю, проходит период подъема и упадка.

Самый замечательный эксперимент — бывшая Восточная Германия. Те же немцы, с той же трудовой этикой, с той же дисциплиной труда, с той же культурой труда, они бы до сих пор без подачек Западной Германии не дошли даже до того уровня производства, который существовал во времена вот этой Германской Демократической Республики.

— Так все-таки причина экономического успеха народа продолжает быть тайной или нет?

— Эмпирический закон вытекает довольно четко: добровольный труд, добровольная изобретательность, добровольное вложение капитала, добровольные инвестиции происходят там, где человек получает по своему вкладу в экономику, то есть где наименьшее перераспределение дохода, где меньше всего социализма.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
8 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Выдадут — не выдадут

Громкое дело об отравлении полонием политэмигранта Александра Литвиненко обрастает все новыми заявлениями которые еще больше его запутывают.

Бывший офицер российских спецслужб Андрей Луговой, подозреваемый британской Королевской прокуратурой в отравлении полонием политэмигранта Александра Литвиненко, на пресс-конференции в Москве утверждал, что Борис Березовский был завербован британской разведкой еще в 1990-е годы, когда работал заместителем секретаря Совета безопасности Российской Федерации. Сам Луговой считает себя "жертвой чужого преступления" и утверждает, что уголовное дело против него было политически мотивированным. Он утверждает, что Ми-6 завербовала Литвиненко, а также пыталась завербовать его, предлагая собирать компромат на президента России Владимира Путина. Великобритания опровергает обвинения Андрея Лугового в том, что британские спецслужбы причастны к смерти бывшего агента российских спецслужб Александра Литвиненко. В свою очередь британская прокуратура считает Лугового главным подозреваемым по этому делу. Источники в британской полиции, близкие к расследованию, всегда утверждали, что доказательство причастности Лугового к смерти Александра Литвиненко основано на том, что следы радиоактивного полония были найдены везде, где бывал Луговой. Именно поэтому было решено официально признать Лугового подозреваемым в убийстве. Британские власти не раз заявляли о своей позиции. Они считают, что дело Литвиненко носит исключительно уголовный характер: британские спецслужбы здесь ни при чем. Сейчас они ждут официального ответа от российской прокуратуры на свой запрос об экстрадиции Андрея Лугового, чтобы судить его на территории Великобритании. Сам Луговой на пресс-конференции так и не смог ответить, собирается он давать показания в Лондоне или нет. Лондон надеется на экстрадицию Лугового. Это позволило бы официально предъявить ему обвинения и судить его на территории Великобритании. У России иное мнение. Ранее генеральная прокуратура России уже заявила, что это невозможно. Российская конституция запрещает выдачу другим государствам граждан страны для суда. Это на днях повторил и Путин. Он заявил, что запрос об экстрадиции Лугового либо ставит вопрос об уровне компетенции тех, кто этот запрос делал, либо показывает, что это "просто пиаровский политический шаг". "Не просто нужно требовать выдачи Лугового, а прислать достаточно материалов, чтобы мы могли дело направить в суд. Мы сделаем это в самой России (в соответствии с конституцией), и будет осужден любой человек, которого посчитают виновным в гибели Литвиненко", — заявил Путин. Это заявление было сделано в интервью журналистам стран Большой восьмерки в преддверии саммита.

Между тем на Западе все громче звучат голоса о необходимости выдачи Лугового.

Заявления Лугового доказывает, что все это дело как-то разрешится лишь в отдаленной перспективе. А вот споры дипломатов и спецслужб — дело совсем недалекого будущего.

По сообщениям Би-Би-Си.

У СОСЕДЕЙ

Что там, в Украине?

Президент Украины Виктор Ющенко подписал принятый Верховной Радой закон о выборах народных депутатов, передает агентство "Интерфакс".

Депутаты установили 50-процентный барьер явки избирателей на внеочередных выборах, при этом обязав Центральную избирательную комиссию установить результаты голосования независимо от количества избирательных участков, на которых голосование было признано недействительным. Также введена норма о том, что при проведении внеочередных выборов депутатов открепительные удостоверения не изготовляются и не используются. Рада отклонила поправку, согласно которой народный депутат предыдущего созыва, полномочия которого были досрочно прекращены по его собственному желанию, не может быть выдвинут кандидатом на внеочередных выборах.

Украинский парламент утвердил новый состав Центризбиркома. Также депутаты приняли изменения в Закон "О государственном бюджете 2007 года", которыми предусмотрено выделить 365 миллионов гривен на подготовку и проведение внеочередных выборов народных депутатов.

Подписание президентом новой редакции закона о выборах и принятие Радой нескольких постановлений позволяет провести внеочередные парламентские выборы 30 сентября 2007 года. Договоренность об этом была достигнута ранее президентом Украины Виктором Ющенко, премьер-министром Виктором Януковичем и спикером парламента Александром Морозом. Виктор Ющенко обратился к политическим силам с просьбой не допустить фальсификаций на досрочных парламентских выборах и особое внимание уделить вопросу наблюдателей. Глава государства подчеркнул, что избирательная кампания лежит на плечах каждого из политиков. "И поэтому — никаких отпусков, никакой потери времени нельзя допускать в этот период", — призвал президент.

Между тем представители фракций БЮТ и "Наша Украина" передали первому вице-спикеру Рады заявления депутатов, подтверждающие их выход из соответствующих фракций. От БЮТ подано 106 заявлений, от "Нашей Украины" — около 60. Этого количества заявлений достаточно, чтобы досрочно прекратить полномочия Верховной Рады 5-го созыва, отмечает агентство.

Члены Центральной избирательной комиссии Украины единогласно избрали председателем ЦИК Владимира Шаповала, сообщает ИТАР-ТАСС. Шаповал, до последнего времени занимавший пост представителя президента в Конституционном суде, был единственным претендентом на эту должность. По данным агентства, за кандидатуру Шаповала на заседании избирательной комиссии, проходившем в закрытом режиме, проголосовали все 15 членов ЦИК. 59-летний Владимир Шаповал с сентября 1996 года по октябрь 2005 года был судьей Конституционного суда Украины, с 2003 года занимал пост заместителя председателя КС Украины. С 2005 года по настоящее время он был представителем президента Украины в Конституционном суде. Шаповал — доктор юридических наук, член-корреспондент Академии правовых наук Украины.

Таким образом президент Украины добился своего — проведения досрочных выборов, несмотря на противодействие парламента и правительства.

Иван ПЕТРОВ.

ФОТОФАКТ

Кубинское телевидение показало сюжет о встрече в Гаване Фиделя Кастро с генеральным секретарем Компартии Вьетнама Нонг Дык Манем, свидетельствующий о выздоровлении кубинского лидера. "На экране предстает почти поправившийся помолодевший Фидель: одетый в спортивный костюм, он оживленно беседует и шутит с вьетнамским руководителем", — сообщает из Гаваны корреспондент испанского телевидения.

НОВОСТИ ИЗ ЛАТВИИ

Что показал Балтийский форум?

Став членом европейского сообщества, Латвия предложила России ряд своих площадок для диалога с Евросоюзом не только коммерческого свойства. Одной из них стал Балтийский форум.

РИА "Новости" решило поддержать усилия Балтийского форума по установлению добрососедства, оказав широкую информационную поддержку. Нынешняя международная конференция, состоявшаяся в конце мая в Риге, задала ее участникам весьма значимую повестку: "ЕС и Россия: договариваясь о новых отношениях".

Чтобы определить дальнейшие практические формы взаимоотношений, требуется уточнить принципы и ценности, на которых они будут строиться. Делать это уполномочены не одни только президенты на саммитах. Европейско-российский диалог нуждается в широком подключении политологов, экономистов, экспертов. Собственно, весь этот спектр авторитетов из России и Европы был представлен в Риге. Впервые и самой Латвии представилась возможность формировать позицию Евросоюза.

Эта страна предложила себя в качестве моста, соединяющего Россию и Европу. Удастся ли Риге справиться со столь ответственной миссией?

Эта тема стала ведущей на видеомосте Рига—Москва, прошедшем в рамках конференции Балтийского форума. В пресс-центре РИА "Новости" собрались российские и иностранные журналисты, чтобы из первых рук получить ответы от латвийских политиков о положении русскоязычных жителей страны, решении проблем многокилометровой очереди на латвийско-российских пропускных пунктах и о самом договоре о границе между нашими государствами. Министр сообщений Айнар Шлесерс сообщил, что в июле у него состоится встреча с его российским коллегой Игорем Левитиным, в ходе которой они смогут "развязать" многие дорожные узлы. Одним из таких шагов будет намеченное в Латвии строительство Московского шоссе.

Похоже, Латвия, заплатившая свою цену за "вход" в ЕС, проходит этот путь быстрее других. Сегодня экономика распоряжается таким образом, что заработки на сырье бывают эквивалентны заработкам на транзите. Вице-президент Евро-Азиатского транспортного союза Юрий Щербинин сделал комплимент балтийским транзитникам, почувствовавшим "вкус" к далекой географии. Они намереваются грузопотоки из Китая и Казахстана, которые скорее всего пойдут в Европу через Россию, замкнуть на латвийские порты. Да и у российского бизнеса альтернативы по существу нет: он исторически использовал латвийские терминалы. Что касается Северо-Европейского газопровода, то подписание соглашения о границе дает шанс Латвии тоже иметь тут свои дивиденды. "Газпром" всерьез рассматривает возможность создания в Латвии резервного газохранилища, способного обеспечить пол-Европы.

Справедливости ради надо добавить, что транзит — не единственный интерес, который Рига проявляет к России. Выход из пике во взаимоотношениях — заслуга не только политиков. Само латвийское общество явно испытывает позитивный настрой. Местные русские тихо говорили мне: "Передайте там в Москве: не надо нас защищать и зарабатывать на этом очки у российского электората".

И действительно, стоит ли сейчас это делать, коль скоро в Риге и Даугавпилсе — самых крупных городах страны — преобладает русскоязычное население. Требуется ли им защита, если русских в ряде фирм с большим удовольствием берут на работу, поскольку бизнес в стране все больше говорит по-русски. На серьезных конференциях и встречах латвийские чиновники тоже стараются выступать на русском. К слову, на видеомосте, организованном РИА "Новости", министр Шлесерс говорил на безупречном русском — оказывается, он окончил русскую школу. И, судя по всему, вовсе об этом не жалеет.

В пафосном магазине янтаря скучающие продавщицы с надеждой ожидают российских туристов, убежденные, что летом именно они "делают погоду". Русские сезоны в Юрмале уже стали традиционными. Отменить бы еще придуманный визовый режим, и можно брать билет к морю. Кому плохо от того, что по пути из России в Евросоюз будет находиться дружественная и процветающая страна?

Элла ТАРАНОВА,
заместитель директора
Главной дирекции стран СНГ
и Балтии РИА "Новости".

МОДНАЯ ТЕМА

Вы видите девушку своей мечты с... секретным паролем

Новая мания свиданий, охватившая землю Казановы, свидетельствует о том, что итальянские мужчины утратили вкус к охоте. Тысячи людей поспешили обратиться в службу знакомств, размещающую короткие сообщения и номер на футболках, что позволяет избежать подвохов интернет-знакомств и опасности быть отвергнутым. Об этом пишет Ричард Оуэн в газете THE TIME.

Процедура следующая: за 38 евро вы покупаете в одном из 250 магазинов футболку, на которой написано имя и номер, образующие код, например, "Кайман 32", "Эмили 14" или "Фэнси 005". Организаторы выдают вам членскую карточку с секретным паролем, позволяющим вам зарегистрироваться на сайте системы — www.shyno.com.

Следующий шаг: вы видите девушку или юношу вашей мечты в такой же футболке на улице, пляже или дискотеке. Вы запоминаете код и посылаете сообщение с комплиментами или видеосообщение на сайт, который передает ему или ей это сообщение вместе с информацией о вас и номером вашего мобильного телефона. Объект ваших желаний может ответить или нет.

"После того, как он или она свяжется с вами, все зависит от вас, — говорит Мауро Фальчинелли, римский представитель системы. — *Просто, анонимно, осторожно и... романтично. Вы видите футболку с кодом, вас поражает ее обладатель — и вы можете попытать счастья".* Он утверждает, что итальянские мужчины не утратили мужских инстинктов, но времена изменились. "Девушкам надоело знакомиться с незнакомцами. Романтика стала делом опасным".

Служба Shyno — детище 28-летнего Симоне Джанколы, студента-медика, пришедшего в отчаяние из-за невозможности познакомиться с прекрасной женщиной, которую он однажды увидел в лодке. "Я увидел эту потрясающую девушку в лодке, это была самая красивая девушка из всех, кого я видел за всю жизнь. У лодки был номер, и я подумал: "Вот бы номер лодки был номером телефона". А потом меня осенило".

Система была сначала опробована в ночном клубе, где бесплатно раздали тысячу футболок. В результате за одну неделю было передано 14.000 текстовых сообщений.

С момента, когда в конце прошлого года была запущена система Shyno, было продано 20.000 футболок. По оценкам Джанколы, к концу года число клиентов составит 200.000, а через три года их будет уже миллион.

60% клиентов — женщины.

СЛЫШАЛИ?

Что такое «китайский синдром»?

В мировом инвестиционном жаргоне много разных слов и выражений. Похоже, придется добавить еще одно — "китайский синдром". Впрочем, его уже используют. Таким образом инвесторы и аналитики обозначают проходящую по мировым фондовым рынкам ударную волну от всяких неожиданностей в Китае.

Раньше не было ни этого выражения, ни этого эффекта. Сегодня оно лишь подчеркивает, насколько важным стал Китай для мировых рынков.

Вот типичный пример "китайского синдрома". Правительство страны решило ограничить объемы торговли на фондовом рынке — по мнению и Пекина, и многих аналитиков, он сильно перегрет. Власти утроили налог — относительно небольшой — на операции с акциями. В результате индекс Шанхайской биржи, на которой и представлено большинство китайских акций, упал на 6,5% за один день. Тут же началась цепная реакция, подобная той, что прокатилась по миру в начале весны. Все европейские рынки открылись со средним понижением котировок почти на 1,5%. В России рынок упал почти на 1%. Снизились котировки и в Америке.

Рост фондового рынка в Китае впечатляет даже тех, кто следит за бурным российским рынком. Лишь с начала года шанхайский индекс вырос более чем в полтора раза, а с начала прошлого года — в четыре раза.

С одной стороны, это следствие бурного подъема китайской экономики. Всемирный банк предрекает на этот год рост в 10,4% — в полтора раза больше, чем в России, — и при этом не считает экономику перегретой. Второй фактор — устремившаяся на фондовые рынки толпа китайских мелких инвесторов. Домохозяйки, клерки, студенты, а не только опытные финансисты, ринулись покупать акции. Это и неудивительно. Вложения в акции в Китае приносят в несколько раз больший доход, чем депозитные счета.

Чем больше простых китайцев становится инвесторами, тем больше спрос на акции и тем выше цены и, соответственно, доходность вложений. А это в свою очередь привлекает новых игроков. Ценовая спираль раскручивается.

Но адреналиновый рост на рынке заставляет беспокоиться крупных финансистов. В середине мая Алан Гринспэн, бывший глава Федерального резерва США, сказал, что по его мнению, китайские акции уже слишком дорогие. Когда его мнение начнет разделять критическая масса инвесторов, обвал может быть столь же значительным, как и рост, и распространится он, без сомнения, на все мировые рынки — не в последнюю очередь и на российский.

И вот тогда выражение "китайский синдром" выучат десятки миллионов по всему миру.

Александр КОЛЯНДР.
Би-Би-Си.

«Для серьезного исторического витка необходимы пятнадцать-двадцать лет»

(Продолжение. Начало на 1-й стр.)

— У нее даже название в этом смысле привлекательное — "Закон и справедливость".

— Да, именно партия ныне управляющих Польшей братьев Качиньских, президента Леха и премьера Ярослава, заявила, что она окончательно разберется с этими ворами, коррупционерами и в Польше восторжествует подлинно нравственная атмосфера, не говоря уже о социальной справедливости. Так возникла идея духовно обновленной и социально отрегулированной Четвертой Речи Посполитой, окончательно избавившейся от коммунистического наследия. В том числе и через механизмы люстрации. К "Закону и справедливости" примкнули две также популистские организации: крестьянская "Самозащита" и национал-католическая, крайне правая "Лига польских семей". Все эти политические образования не отличаются стремлением к защите прав личности, отстаиванию независимости судебной власти, в целом к соблюдению принципа разделения законодательной и исполнительной властей. А люстрационная политика в известной степени превратилась в дубинку для расправы с неугодными. Началась охота на ведьм...

— Но пресса-то уж как будто у вас свободна...

— Свободна-то свободна, но в определенной степени часть медиа контролируется правящими кругами, прежде всего той же партией "Закон и справедливость". И это является одной из серьезных причин для разговора о нарушении демократических норм в нашей стране.

— А Вы говорили, что нет стремления политиков к ограничению демократии.

— Конечно, есть и такие тенденции в нашей политической верхушке. Но прежде всего налицо согласие известной части общества на проведение такой политики "твердой руки", и именно на это согласие опираются нынешние руководители Польши. Поэтому существующее беспокойство по поводу угрозы для демократического развития Польши небеспочвенно. Вместе с тем следует отдавать себе отчет в том, что эта ситуация является своего рода счетом, выставленным демократическим силам за то, что они не захотели принять во внимание интересы значительной части общества.

— Но можно ли было, в самом деле, избежать экономических трудностей в переходный период?

— Скорее всего вряд ли. И поэтому результат политический не мог быть иным. Это то, через что необходимо пройти. Надеюсь все-таки, что это не приведет к уничтожению демократии в нашей стране.

— Насколько я понимаю, Вы, как историк, утверждаете неизбежность прихода к власти популистов, социальных и национальных демагогов в посткоммунистический период. Признаюсь, что меня занимают некоторые сближения между белорусским режимом и нынешней властью в Польше. Это очевидная авторитарность режима в Беларуси и различные проявления тяги к авторитарности в Польше. Это ненависть власть предержащих к "образованным", "высоколобым". Как симптоматично это пущенное сверху польское выражение "wykształciuchy", адекватное русскому "шибко грамотные". И эта поощряемая опять-таки сверху борьба с "лжеэлитами", а на самом деле с людьми, составляющими цвет польской нации, внесшими неоценимый вклад в дело польской свободы, в национальную культуру.

— Разумеется, можно говорить о некоторых параллелях. Но суть в том, что даже при этих параллелях Польша тем не менее остается демократическим государством. И здесь громадную роль играют как либерально-демократическая ориентация значительной части польской интеллигенции, так и принадлежность нашей страны к Европейскому Союзу. Поэтому соблазны править "твердой рукой" сталкиваются с серьезными препятствиями. Вместе с тем наивным было бы считать, что Евросоюз удержит у нас демократию, ежели мы сами не будем прилагать определенные усилия в этом направлении.

— Удержание демократии, позволю себе употребить Ваше выражение, это ведь не только следование определенным политическим, нравственным принципам, но и одновременно процесс экономический. Надо полагать, что именно здесь поддержка Евросоюза является для Польши определяющей.

— Безусловно. Нынешняя очень приличная у нас экономическая конъюнктура прежде всего связана с финансовой поддержкой, оказываемой Европейским Союзом. Идет помощь нашим крестьянам, мы получили полноценные рынки сбыта своей сельскохозяйственной продукции. Наконец, наши граждане имеют возможность работать в странах Запада, и это позволило снизить уровень безработицы.

— Но возникают другого рода проблемы — отъезд высококвалифицированных специалистов, молодежи.

— А почему наш специалист-медик должен получать в два-три раза меньше, чем его коллега на Западе? Пускай над этим думает правительство. Наши специалисты с удовольствием останутся у себя на родине, если будет обеспечен достойный уровень оплаты их труда. Хотя, конечно же, отъезд предприимчивых, образованных, молодых — это не на пользу стране.

— А хорошо ли это, когда бастуют врачи, больницы не принимают больных, не делаются операции?

— Разумеется, ничего хорошего. Но люди отстаивают свои права, ведут переговоры с правительством профсоюзы. И это, кстати, еще одно существенное отличие нашего "авторитаризма" от белорусского. Я что-то не слышал о действиях белорусских профсоюзов, об активной защите ими прав своих членов.

— Увы, профсоюзы в Беларуси огосударствлены, в том смысле, что находятся под тесной опекой власти. А те, что считаются независимыми, малочисленны и по сути не видны. Недавно студентов лишили льготного проезда в городском транспорте — большинство промолчало. Немногих, вышедших с перформансным протестом, милиция быстро "нейтрализовала". Зато одна высокая чиновница даже удивилась, что молодые люди, представляющие прогрессивное поколение, так болезненно отнеслись к отмене льгот. Конечно, ей с ее доходами, непонятно, как и на что живут студенты...

— У нас такое невозможно. Во всех цивилизованных странах правительства стремятся облегчить жизнь студентам, им предоставляются всевозможные льготы, в том числе и по проезду, и не только в своем городе, но и по стране и за границей. Молодой человек должен видеть мир... А вообще бороться нужно не за льготы, а за достойную жизнь. А она возможна только при демократических порядках. Это очевидно.

— Вот вы говорите о демократических порядках, несомненно имея в виду их вполне определенное, традиционное понимание. Между тем, как показывает опыт и сегодняшней России, и сегодняшней Беларуси, руководство этих стран склонно говорить о некоей особой демократии, своей, доморощенной, отличающейся от европейских стандартов. Дескать, не учите нас демократии, поскольку у нас она своя, непохожая на вашу...

— Знаете, демократия это не суп, который можно приготовить и так и этак. Она или есть, или ее нет.

— А я слышу за этими рассуждениями об "особой демократии" стремление утвердить мысль, что есть народы и страны, которым демократия вообще не нужна. Мол, у них такая ментальность, заряженная больше на царя, независимо от того, как он называется, — президент или еще как-то.

— Не думаю, что белорусы являются народом, настроенным подобным образом. Тем более — молодое поколение, которое уже убедилось, что жизнь может быть иной. Кстати, хочу подчеркнуть, что и мы, поляки, свое будущее в немалой степени связываем с тем, как будут развиваться и Беларусь, и Украина. Ежи Гедройц, можно сказать, завещал польским элитам концепцию европейской политики, согласно которой свобода и независимость нашей страны могут быть с большим успехом гарантированы при условии, если Украина, Беларусь и Литва также пойдут по демократическому пути. Поэтому он резко возражал против каких-либо территориальных претензий со стороны Польши. В какой-то степени здесь просматривается доктрина Пилсудского начала 20-х годов прошлого века.

— С Украиной у Польши достаточно серьезные исторические счеты. И тем не менее они преодолеваются, свидетельством чему успех Квасьневского в Киеве во время "оранжевой революции". Что же касается Беларуси... И счетов у нас, по крайней мере таких суровых, нет... А впечатление такое, что Польша уже молчаливо согласилась на то, что Беларусь такова, какова есть, и другой быть не может. Я, разумеется, толкую не о возможности вмешательства во внутренние дела. Это вещь недопустимая. Речь идет о расширении и углублении контактов по всем направлениям. Замечательно, что у вас учатся белорусские студенты, что им оказывается за счет польского государства поддержка. Но вот с будущего года Польша начнет выдавать шенгенские визы. И мы не без тревоги думаем о том, как это отзовется на возможностях наших граждан посещать вашу страну.

— Что касается Шенгена, то, полагаю, наше Министерство иностранных дел найдет возможность сделать так, чтобы введение новых виз не имело таких последствий, как сокращение поездок белорусов в Польшу. Мы в этом не заинтересованы. Напротив — мы за расширение контактов. Что же до белорусской перспективы... Скажу общеизвестное: о своем будущем каждый народ должен заботиться сам. Это подтверждает, кстати, и опыт ближайших соседей Беларуси — Украины, Литвы... А Польша, конечно же, могла бы использовать свое членство в Европейском Союзе для укрепления и развития демократических и одновременно экономических процессов в Беларуси. Но чтобы эта политика имела успех, необходимы более чем определенные шаги в деле демократизации вашей страны, шаги, которые могли бы предпринять совместно власть и оппозиция. Здесь уже необходимо серьезное общественное давление, ярко выраженное желание общества осуществить перемены. Пока такого желания, кажется, не наблюдается. Впрочем, оно, несомненно, есть у наиболее активной части общества — мы видим это по протестам, демонстрациям, пикетам на улицах ваших городов, — но широкой народной поддержки, видимо, не имеет. Если выражаться еще точнее, более широкие общественные устремления и ожидания пока носят пассивный характер... Но жизнь идет. И у нее свои законы, которых вряд ли сможет избежать и Беларусь. Печальный опыт Советского Союза должен многому научить.

— Увы, не все политики хотят учиться у истории. Наверное, им кажется, что их предшественники, к примеру, тот же Сталин или Горбачев, совершили ошибки, которых уж они-то никогда не совершат.

— Печальное и даже трагическое заблуждение.

— Особенно печально, когда оно затягивается на долгие годы.

— Ну, здесь нужно быть терпеливым. Как историк, могу сказать, что быстро серьезные изменения не происходят. Для какого-то ощутимого исторического витка необходимы как минимум пятнадцать-двадцать лет.

— Выходит, Беларусь еще где-то посередке... Если считать с середины девяностых годов...

— И все-таки не следует забывать слова великого русского человека и большого друга Польши Александра Герцена: "Чрезмерный оптимизм — большое горе, но пессимизм — еще большее несчастье".

Варшава—Минск.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

УВАГА!

Запрашаюцца добраахвотнікі

Прафесар кафедры гісторыі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта доктар гістарычных навук Сяргей Рассадзін звяртаецца да ўсіх ахвотных паўдзельнічаць у археалагічных раскопках, якія ён сёлета будзе праводзіць у Светлагорскім раёне. Добраахвотнікі могуць папрацаваць на першых раскопках у Шацілках — старадаўняй частцы Светлагорска, а таксама на раскопках у вёсцы Каралёва Слабада-2 — на месцы горада Казімір, які існаваў у XVII стагоддзі.

Раскопкі ў Шацілках запланаваны на другую палову чэрвеня. Шацілкі — былая вёска, якая вядомая па дакументах з 1560 г. (у 1961 г. Шацілкі былі ператвораны ў Светлагорск). Летась па ініцыятыве мясцовай грамадскасці і з дапамогай добраахвотнікаў С.Рассадзін выявіў месца, дзе ўзніклі Шацілкі. У часы Вялікага Княства Літоўскага, асноўнай часткай якога з'яўлялася Беларусь, большасць насельніцтва Шацілак складалі зямяне — сялянства, якое несла вайсковую службу, і шляхта. Адсюль папаўнялася адна з вайсковых частак — Рэчыцкая харугва, якая праявіла сябе ў розных бітвах.

У ліпені Сяргей Рассадзін мяркуе працягнуць раскопкі ў вёсцы Каралёва Слабада-2, на месцы былога горада Казімір. Горад меў Магдэбургскае права і быў разбураны ў час вайны з Расійскай дзяржавай у 1655 г. Раскопкі тут пачаліся летась, таксама па ініцыятыве грамадскасці Светлагорска, і прынеслі плённыя вынікі. "Казімір праіснаваў усяго два дзесяткі гадоў і ўтрымлівае, як мы кажам, "чысты" археалагічны матэрыял, які адносіцца да сярэдзіны XVII стагоддзя", — гаворыць прафесар Рассадзін. На яго думку, гэта месца можа стаць для навукі эталонным помнікам матэрыяльнай культуры XVII ст. Дарэчы, у наступным годзе спаўняецца 365 гадоў з часу заснавання Казіміра.

Усім, хто цікавіцца гісторыяй, археалогіяй і краязнаўствам і можа прысвяціць частку свайго вольнага часу добраахвотнай працы на археалагічных раскопках, Сяргей Рассадзін прапануе звязацца з ім па мабільным тэлефоне 567-59-22.

І ТАК БЫВАЕ

Падземны пераход для... жаб

Падземны пераход для жаб пабудавалі на аўтатрасе Мінск—Віцебск. Хуткасная аўтадарога праходзіць праз Бярэзінскі біясферны запаведнік і ляжыць на шляху міграцыі жаб.

Вясной на гэтым 300-метровым участку дарогі пад коламі аўтамабіляў гінулі да 50% папуляцыі земнаводных.

Адзіны на тэрыторыі Садружнасці незалежных дзяржаў пераход, пабудаваны адмыслова для жаб, уяўляе сабой пяць труб, пракладзеных пад дарогай. А каб земнаводныя знайшлі гэты пераход, зроблена невялікая бетонная агароджа.

БЕЛТА.

СІТУАЦЫЯ

Мінулае без будучыні,

або Гвалт над старым горадам

Грамадскасць Віцебска ўзрушана планамі новай забудовы гістарычнага цэнтра горада. На думку месцічаў, гэта знішчыць ягоную самабытнасць, нанясе непапраўную шкоду помнікам даўніны. Найбольш абуральна, што гвалт над старажытным горадам адбываецца з дазволу мясцовых улад.

Агрэсія дзяржавы супраць гістарычнай спадчыны Віцебска пачалася больш як 70 гадоў таму і доўжылася разам з бязбожнай савецкай эпохай, за час якой у Віцебску былі зруйнаваны Успенскі сабор, касцёл Святога Антонія, Уваскрасенская і Дабравешчанская цэрквы, іншыя культавыя і свецкія помнікі архітэктуры. Ужо напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя ледзь не разбурылі Пакроўскую царкву, але намаганнямі грамадскага руху "Узгор'е" пад кіраўніцтвам археолага Ігара Цішкіна і журналіста Сяргея Навумчыка будынак быў уратаваны, а пазней яго аднавілі і зрабілі галоўным храмам праваслаўнай епархіі.

Жорсткая барацьба ўлад з рэгіёніяй і культурнай спадчынай скончылася пасля развалу СССР. За апошнія 10—15 гадоў у Віцебску адноўлены шэраг цэркваў, пачалася адбудова Успенскага сабора і Уваскрасенскай царквы. З'явілася надзея на аднаўленне храма Святога Мікалая, які стаяў на плошчы Свабоды і быў узарваны каля паўстагоддзя таму. Але сёлета грамадскасць горада даведалася, што прыкладна там, дзе доўгі час знаходзіўся комплекс Мікалаеўскага храма, плануецца ўзвядзенне велізарнага Забаўляльнага маладзёжнага цэнтра. Гэта ўсхвалявала грамадзян: яны зразумелі, што новабудоўля зробіць сумнеўным аднаўленне святыні, а калі яна ўсё ж будзе адноўлена, перашкодзіць весці там набажэнствы, якія могуць быць малітвы побач з маладзёжнымі забавамі?

Сотні праваслаўных вернікаў падпісалі пратэст супраць будаўніцтва. Ліст быў перададзены ў гарвыканкам і аблвыканкам, але канкрэтных вынікаў гэтая акцыя пакуль што не прынесла: рашэнне гарадскіх улад аб узвядзенні забаўляльнай установы на месцы, намоленым продкамі гараджан, не адменена.

Вестка аб новабудоўлі ў гістарычным цэнтры непакоіць не адных вернікаў. Многія людзі тэлефанавалі з пытаннем пра гэта ў рэдакцыі мясцовых газет, а журналісты ў сваю чаргу звярталіся да галоўнага архітэктара Віцебска Барыса Лядэнкі, які ў адпаведнасці са службовымі абавязкамі з'яўляецца асобай, адказнай за стан гістарычнага цэнтра горада. Спадар Лядэнка супакойваў: па-першае, маўляў, пытанне аб забаўляльным цэнтры яшчэ канчаткова не вырашана, а па-другое, калі будоўля і пачнецца, то не на месцы храма, а ў баку ад яго. Да таго ж гэта ніколькі не пашкодзіць гістарычнай спадчыны, якая ў любым выпадку застаецца недатыкальнай.

Між тым сёлета ўвесну на плошчы Свабоды з'явіліся будаўнічыя вагончыкі. І зноў Б.Лядэнка супакоіў гараджан: вагончыкі — толькі часовы прытулак падрадчыкаў, занятых рэканструкцыяй Летняга амфітэатра.

Аднак неўзабаве на плошчы ўзніклі экскаватары і свідравальная тэхніка. Ударнымі тэмпамі яны ўтварылі катлаваны глыбінёй каля чатырох метраў.

Месцічы, неабыякавыя да гарадской спадчыны, зноў занепакоіліся, але гарадскія ўлады праз прэсу патлумачылі, што на плошчы вядуцца неабходныя гораду работы па замене састарэлага каналізацыйнага калектара. Пацвердзіўшы гэта, падрадчык — "Віцебскводаканал" — вуснамі намесніка дырэктара прадпрыемства Івана Сырбу запэўніў грамадскасць, што праект работ узгоднены з галоўным архітэктарам Віцебска Барысам Лядэнкам.

Праз колькі дзён выявілася, што, дзейнічаючы ў адпаведнасці з узгодненым праектам, водаканальшчыкі парушылі частку цаглянай кладкі сабора Святога Мікалая.

Гэта быў скандал! Паводле сігнала галоўнага спецыяліста па ахове помнікаў упраўлення культуры аблвыканкама Ніны Сулецкай з Мінска паспяшалася доктар гістарычных навук, археолаг Інстытута гісторыі НАН Рэспублікі Беларусь Вольга Ляўко, якая мае адкрыты ліст на археалагічныя даследаванні ў Віцебску. Яна без цяжкасці зразумела, што земляныя работы ў гістарычным цэнтры горада вяліся без належных узгадненняў з Міністэрствам культуры і Нацыянальнай акадэміяй навук. Іначай у Віцебску быў груба парушаны закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

В.Ляўко і Н.Сулецкая склалі пратакол аб незаконных работах на тэрыторыі, якая з'яўляецца запаведнай і ахоўваецца дзяржавай. Н.Сулецкая, акрамя таго, напісала заяву аб парушэнні закону і накіравала яе ў абласную пракуратуру. Там спачатку адмовіліся разглядаць зварот Ніны Андрэеўны, але калі гэтую заяву падпісаў і яе начальнік — кіраўнік абласнога аддзела культуры М.Пашынскі, пракуратура, магчыма, усё ж прыме адпаведныя захады не толькі да прадпрыемства "Віцебскводаканал", але і да галоўнага архітэктара Віцебска Барыса Лядэнкі, які даў "дабро" на земляныя работы ў гістарычным цэнтры горада.

Дарэчы, прадстаўніца Нацыянальнай акадэміі навук Вольга Ляўко прымусіла "Віцебскводаканал" прыпыніць земляныя работы і падпісаць адмову на тое, што любыя наступныя работы могуць весціся толькі пад наглядам археолагаў.

Чым скончыцца віцебскае супрацьстаянне гісторыі і сучаснасці, пакуль сказаць немагчыма. Вядома толькі, што літаральна праз колькі дзён пасля прыпынення земляных работ на плошчы Свабоды "Віцебскводаканал" зноў пачаў рыцца ў культурных слаях XIII—XVIII стагоддзяў. На плошчы з'явілася велізарная глыбокая траншэя, у час капання якой былі разбураны падмуркі архітэктурнага ансамбля храма Святога Мікалая. А гэта робіць немагчымым аднаўленне гэтай віцебскай гістарычнай святыні.

Нагадаем, што гэты гвалт над віцебскай спадчынай адбываецца з ведама і дазволу чалавека, які абавязаны ахоўваць запаведны цэнтр горада. Чым кіруецца спадар Б.Лядэнка, дапускаючы здзек над тысячагадовым Віцебскам, цяжка здагадацца. Адна надзея, што пракуратура здагадаецца, чаму так грэбуе сваімі абавязкамі галоўны архітэктар тысячагадовага горада на Заходняй Дзвіне.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПАРАЛЕЛІ

Чыпсавая гасціннасць,

альбо Крыху пра тое, чым беларус адрозніваецца ад бельгійца

Сустракаю днямі ў брусельскім трамваі №90 знаёмую расіянку Таню, якую не бачыў ажно з 1999 года. У той час гэта была дагледжаная, прывабная і ўсмешлівая кабета, якая, закахаўшыся ў бельгійца, пераехала да яго жыць. Шчасце проста свяцілася ў яе вачах... Шмат вады сплыло за восем гадоў. Кабета, здаецца, цяпер нейкая засмучаная, заклапочаная. Шчасце, калі і засталося ў яе вачах, то недзе ў самых глыбінях. Аказваецца, распачала цяпер ужо бельгійка Таня шлюбаразводны працэс. "А чаму? — здзіўляюся. — Такое ж каханне было". "Было, ды сплыло, — сумна адзначае мадам. — Дакладней, патанула ў скнарнасці. Мала таго, што прадукты набываю на ўсю сям'ю за свае ўласныя грошы, дык я яшчэ і падарункі сама сабе раблю на Каляды і дзень нараджэння". Апошняй кропляй, што перапоўніла чашу цярпення, стала запрашэнне мужа адвячэраць у рэстаране. Пасядзелі, пагутарылі, пад'елі, выпілі. Раптам муж падымаецца, аплачвае сваю частку рахунку і фффф'юююююць — дахаты...

Так, мы розныя. Менталітэт жыхароў Заходняй і Усходняй Еўропы адрозніваецца вельмі значна. Нездарма кажуць: што рускаму добра, то немцу — смерць. Але, як выказалася тая ж мадам Таня, "яны, заходнееўрапейцы, не горшыя і не лепшыя за нас, яны проста іншыя".

Далоў стэрэатыпы!

Пра прыродную скнарнасць бельгійцаў ходзіць даволі шмат баек. Самая папулярная з іх — пра мільянера, які, маючы чатырохпавярховую вілу, захапляецца "навуковым мыццём у ванне". Што гэта такое? — спытаеце вы. А гэта калі галава сямейства напаўняе ванну, мыецца ў ёй сам, а потым "настойліва рэкамендуе" памыцца ў гэтай жа вадзе спачатку жонцы, а потым і дзецям.

Скажу шчыра, выпадкі ашчаднасці і эканомнасці "абарыгенаў" сустракаю на кожным кроку. Менавіта з гэтай нагоды паспяховымі з'яўляюцца разнастайныя рэкламныя кампаніі, звязаныя з распродажамі. Літаральна ўсё насельніцтва с цікавасцю сочыць за рэкламай, і калі недзе ўзнікае магчымасць заплаціць меней, лавінай кідаецца туды. З гэтай жа нагоды, лічу, паспяхова прасоўваюцца зараз на еўрапейскі рынак кітайскія тавары — проста таму, што яны таннейшыя.

Адзінае выключэнне, мусіць, з гэтай эканомнай бельгійскай масы — мая настаўніца нідэрландскай мовы, якую завуць Лівэ. Гэта 45-гадовая жвавая жанчына, сапраўдная фламандка, даволі моцна пакрыўдзілася на мяне, калі я, ацэньваючы якасці "сапраўдных фламандцаў", напісаў у сачыненні, што яны "вельмі і вельмі гасцінныя, асабліва што тычыцца чыпсаў і мінералкі". Але гэта насамрэч! Калі вас запросіць у госці фламандзец, 90% верагоднасці таго, што на стале будзе стаяць выключна гэта. А паколькі Лівэ — выключэнне з усіх правілаў ды стэрэатыпаў, яна, я ўпэўнены, зрабіла проста геройскі ўчынак. Спачатку папрасіла мяне набыць ва ўкраінскай краме за яе грошы некалькі бутэлек гарэлкі з перцам, а потым... пачаставала ёю ўсіх курсістаў прама на занятках. Fantastisch!

Зносіны — раскоша

Гэтае вядомае выказванне Сент-Экзюперы знаходзіць сваё пацвярджэнне і ў Бельгіі. Бельгійцы не ставяцца да зносінаў з незнаёмымі людзьмі лёгка, як да само сабой зразумелага. Лічыцца, што у Заходняй Еўропе не заводзяць знаёмстваў на вуліцы, у цягніку альбо на прыпынку аўтобуса. Калі такі кантакт узнікае, для гэтага, часцей за ўсё, павінна існаваць належная нагода. Напрыклад — мова (бельгійцы захапляюцца замежнымі мовамі), альбо дом, альбо дзеці, альбо надвор'е. Прычым дом, сад, будоўля маюць на парадак вышэйшы прыярытэт, чым традыцыйнае надвор'е. Нездарма бельгійцы самі пра сябе жартуюць, што нарадзіліся "з цэглай у брусе". Не абмінаюць яны і плёткі. І папляткарыць любяць, сцвярджаю, не толькі жанчыны, але і мужчыны. У тым ліку, на працоўным месцы.

Міні-кантакты на вуліцы ўсё ж такі адбываюцца. І даволі рэгулярна! Напрыклад, да каляскі з маёй 10-месячнай дачушкай па некалькі разоў на дзень падыходзяць незнаёмыя людзі, якія даюць разнастайныя парады — што рабіць, калі дзіця чхае ці не хоча спаць. Альбо проста раздаюць камплімэнты юнай мадэмуазэль. Кантакты гэтыя спантанныя, кароткатэрміновыя, ні да чаго не абавязваючыя. Проста, мне падаецца, людзі падымаюць сабе і іншым настрой.

Ca va? Gaat het?

Так гучыць па-французску і па-нідэрландску звычайнае "Як справы?". У адказ на гэтае пытанне вы ніколі не пачуеце ад бельгійца слязлівы маналог пра адсутнасць грошай, пачвару-начальніка альбо гаргоноцешчу. Як бы дрэнна ні складваліся ў бельгійца справы, трэба аддаць яму належнае — ён заўсёды ветліва ўсміхнецца ў адказ: "Выдатна! Вельмі добра! Фантастычна!" Так прынята. Па-іншаму вас проста не зразумеюць. Чаму? Таму што прынцып усялякіх зносін на Захадзе — "не абцяжвай".

Пасля традыцыйных "Са ва? Са ва!" альбо "Хат хет? Худ!" звычайна адбываецца кароткая, на дзве-тры хвіліны, размова часцей за ўсё пра поспехі. Існуе некалькі табуіраваных тэм, якія звычайна не абмяркоўваюцца. Калі нехта іх усё ж такі падымае, дыскусія хутка згортваецца. Сярод такіх табу — фінансавае становішча вашага суразмоўцы, здароўе, персанальнае жыццё, нават палітычная пазіцыя. Можна, канешне, паразмаўляць пра палітыку наогул, "пра Буша з Пуціным", але палітычная пазіцыя — гэта жорсткі інтым. У Бельгіі лічыцца, што погляды суразмоўцаў могуць адрозніваца і ўзнікне спрэчка.

Спрабую ўявіць сабе сітуацыю, калі ў беларусаў раптам аднялі вышэйназваныя тэмы. Што яны будуць абмяркоўваць?

«Вось куля праляцела, і ага!..»

На фоне таго, што ўсе бельгійцы нарадзіліся, як адзначалася вышэй, с "цэглай у брусе", некаторыя з іх, відаць, маюць яшчэ і "кулю ў галаве". Гэта, канешне, перабольшванне і жарт, але, як кажуць, у кожным жарце заўсёды ёсць доля праўды. І зразумець гэтую "кулю" нам, эмацыянальным усходнееўрапейцам, часам вельмі і вельмі няпроста. Паспрабую прывесці на гэты конт зразумелы прыклад.

Калі вы араб, то ў вачах 80% бельгійцаў вы абавязкова адзін з сяброў Усамы бен Ладэна, калі — чорнаскуры, то гарантавана носьбіт СНІДу, калі вы рускамоўны альбо беларускамоўны, то амаль стопрацэнтна член рускай мафіі. Альбо, на худы канец, кандыдат у члены. Аднойчы я прачытаў у адной з мясцовых газет артыкул пад назвай "Забабоны", у якім бельгійцы самі прызнаюцца (згодна з вынікамі сацыялагічных апытанняў), што жывуць у абсалютнай большасці гэтымі самымі забабонамі.

Дзе ты, мой прынц на белай кабыле?

Такое пытанне наўрад ці ставіць калі-небудзь перад сабою бельгійская мадэмуазэль, якая пакуль не выйшла замуж, але плануе аднойчы гэта зрабіць. Уладкаваць сваё асабістае жыццё, сустрэць каханне хочуць усе маладыя асобы — і на Захадзе, і на Усходзе. Але патрабаванні беларускай маладой лэдзі і бельгійскай значна адрозніваюцца. Нашыя людзі, часцей за ўсё, шукаюць нейкае ідэальнае каханне, прад'яўляюць сваёй пасіі найвышэйшыя, часам невыканальныя патрабаванні. У некаторых чаканне свайго прынца, "сапраўднага" героя зацягваецца на ўсё жыццё...

Погляды і чаканні маладой бельгійкі больш практычныя. Яна цудоўна разумее, што яе прынц сядзіць, часцей за ўсё, не на белай кабыле, а за суседняй партай ва універсітэце альбо за суседнім сталом на фірме, дзе яна працуе. Яна не пакутуе з нагоды адсутнасці нейкага абстрактнага ідэалу. Маладыя бельгійцы ўжо ў 17—18 гадоў знаходзяць сабе партнёра, сябра. Такі партнёр не можа быць ідэальным, у яго заведама шмат недахопаў. Але калі яго прымаюць, ён становіцца сталым партнёрам, то далей пачынаецца самае галоўнае — рост адносінаў, а дакладней, клапатлівае з абодвух бакоў іх будаванне, развіццё. Часам такія адносіны завяршаюцца афіцыйным шлюбам, часам — партнёры жывуць у грамадзянскім шлюбе ўсё жыццё.

Бельгіец чакае гасцей.

Фота Стэфана ВАНФЛЕТЭРЭНА.

Штрыхі

Бельгійцы вітаюць адзін аднаго па некалькі разоў на дзень, ніколі не адзначаючы, што "ўжо бачыліся". Лічыцца, што калі вы не вітаеце чалавека, нават калі сустракалі яго і віталіся хвіліну таму, вы яго абражаеце. Бельгійцы заўсёды дзякуюць за тэлефонны званок, нават калі размова была не вельмі прыемнай.

Бельгійцы, калі хочуць сустрэцца з сябрамі, аддаюць перавагу кафэ і рэстаранам і амаль ніколі не прымаюць гасцей дома. Для дарослага бельгійца ледзьве не найвышэйшая каштоўнасць існавання — "выходзіць у свет", атрымліваць асалоду ад жыцця па-за межамі дома. Нездарма гэтае паняцце "uitgaan" па-нідэрландску альбо "sortir" па-французску так цяжка перакласці на беларускую мову.

Бельгійскі кіроўца амаль заўсёды саступіць дарогу пешаходу, які хоча перайсці па пешаходным пераходзе. Бельгійцы абавязкова прытрымліваюць дзверы перад тым, хто ідзе следам. Вялікая колькасць бельгійскіх мужчын вітае адзін аднаго не рукапасканнем, а пацалункам. Не "брэжнеўскім", канешне, але пацалункам.

Калі вас запрасілі на бельгійскае вяселле, то хутчэй за ўсё дашлюць разам з запрашэннем яшчэ і адрас крамы і спіс патрэбных маладым рэчаў. У зручны для вас час вы зможаце прыехаць у гэтую краму, выбраць рэч са спісу і, у залежнасці ад фінансавых магчымасцяў, аплаціць яе поўнасцю альбо часткова.

І нарэшце адметнасць з тлустым знакам "мінус". Бельгійцы амаль ніколі не саступаюць месца ў грамадскім транспарце. Ні сталым людзям, ні маленькім дзецям, ні цяжарным жанчынам. Такі вось нацыянальны "гонар". І калі вы раптам здзейсніце нармальны, з пункту гледжання беларуса, учынак, на вас паглядзяць як на нацыянальнага героя!

«Нашы» ў горадзе

Рускамоўная дыяспара ў Бельгіі адна з найбуйнейшых, і, як сцвярджае статыстыка, яе колькасць кожны год расце. Рускамоўныя — гэта і рускія, і беларусы, і туркмены, і армяне, адным словам, усе, хто ў свой час трапіў пад СССРаўскі дах. Нярэдка сустрэча ў Бельгіі з былым суайчыннікам выклікае станоўчыя эмоцыі і часам робіцца сяброўствам. Але бываюць і выключэнні. І чым больш жывеш за мяжой, тым, прызнаюся, больш падобных выключэнняў.

Аднойчы быў сведкай цікавай сітуацыі. Набываю праязны абанемент на транспарт фламандскай кампаніі "de Lijn". Перада мною стаяць два "браткі" ў спартыўных касцюмах. Гандляр пытае іх, ці першы раз яны набываюць праязны. Спачатку па-нідэрландску: "Eerste keer?" Не разумеюць. Потым па-французску: "Premier fois?" Нуль эмоцый. Ну і вельмі здзіўлена па-англійску: "First time?" Усё роўна не разумеюць. Раптам адзін з "браткоў" звяртаецца да сябра па-руску: "И почему это они не говорят на великом и могучем?"

Іншы раз у брусельскім аўтобусе можна пачуць такі шыкоўны мат па-руску, што хочацца, шчыра кажучы, на некалькі хвілін забыць пра тое, што ты разумееш "великий і могучий", і стаць звычайным бельгійскім "абарыгенам". Нягледзячы на іх чыпсавую гасціннасць і кулю ў галаве.

Толькі, калі запрашу да сябе гасцей, накрыю стол па нашай беларускай традыцыі. У грамадскім транспарце абавязкова саступлю месца бабульцы. Ну і, канешне, ніколі не адкамандзірую сваю жонку памыцца ў "другой вадзе".

Алесь СІЛІЧ,
спецыяльна
для "Народнай волі".

Брусель.

ТЫМ ЧАСАМ

«Беллітфонд» ліквідуюць па даносе?

Ліквідуемае грамадскае аб'яднанне "Беларускі літаратурны фонд" абскардзіла рашэнне Вярхоўнага суда аб ліквідацыі арганізацыі. Наглядныя скаргі накіраваны ў Вярхоўны суд і на адрас Генеральнага пракурора Пятра Міклашэвіча.

У дадатак да нагляднай скаргі "Беллітфонд" накіраваў генпракурору Пятру Міклашэвічу спецыяльны зварот у сувязі з "незаконнай", на думку літаратараў, ліквідацыяй арганізацыі. *"Вярхоўным судом груба парушаны нормы матэрыяльнага і працэсуальнага права і канстытуцыйныя правы як нашага грамадскага аб'яднання, так і ўсіх яго членаў"*, — гаворыцца ў дакуменце.

Вярхоўны суд, мяркуе праўленне "Беллітфонду", не даў, як таго патрабуе закон, грамадскаму аб'яднанню ні часу, ні магчымасці падрыхтавацца да працэсу. *"Мы былі і застаёмся гатовымі ў адпаведнасці з заканадаўствам абскардзіць усе закіды Міністэрства юстыцыі, паводле якіх судом было прынята ліквідацыйнае рашэнне.*

Паводле рашэння Вярхоўнага суда, падставай для ліквідацыі ГА "Беллітфонд", членамі якога з'яўляюцца больш за 250 вядомых пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатаў прэстыжных літаратурных прэмій і званняў, сталі:

1) наяўнасць смецця на тэрыторыі ўстановы "Санаторый-прафілакторый пісьменнікаў "Іслач";

2) надуманае парушэнне статута ГА "Беллітфонд", якое нібыта пацвярджаецца (цытуем) "пісьмом на адрас Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад імя 149 членаў аб'яднання".

Што да першай прэтэнзіі, то "Іслач" з'яўляецца самастойнай юрыдычнай асобай, якая належыць "Беллітфонду", і за смецце на тэрыторыі СПП нясе адказнасць менавіта "Іслач". Хаця пасля выяўлення парушэнняў на тэрыторыі "Іслачы" пісьменнікі правялі суботнік па ўборцы тэрыторыі, але суд гэтыя абставіны не даследаваў.

А вось гісторыя з "пісьмом 149-ці" набыла відавочна скандальны характар.

"Згаданы ліст ад былых членаў ГА "Беллітфонд" разглядаем як грубы паклёп і ўвод дзяржаўных інстытуцый у зман. У лісце 28 фізічных асоб праз два (!) гады нематывавана і без належнага дакументальнага абгрунтавання (без даверанасцяў і т.п.) скардзяцца ад імя 149 (!) членаў аб'яднання на тое, што не былі запрошаныя на Агульны сход ГА "Беллітфонд" у 2005 годзе. На згаданы Сход запрашаліся ўсе члены "Беллітфонду", больш за тое, сярод 28 "падпісантаў" ёсць тыя, хто прымаў удзел у згаданым Сходзе і паставіў свой подпіс у рэгістрацыйным спісе", — пішуць на імя генпракурора кіраўнікі "Беллітфонду": старшыня Алесь Пашкевіч, Эдуард Акулін, Анатоль Кудравец, Барыс Сачанка, Міхась Скобла, Кастусь Цвірка, Васіль Яканенка, Эрнест Ялугін, Язэп Янушкевіч, Алесь Данільчык.

Ліквідацыя "Беллітфонду" праводзіцца фактычна па даносе "пакрыўджаных".

Праўленне "Беллітфонду" ўведамляе Пятра Міклашэвіча, што мусіць інфармаваць *"аб катастрафічнай сітуацыі ў нашай арганізацыі Беларускую канфедэрацыю творчых саюзаў і Міжнародны літаратурны фонд (Масква)". "Вярхоўны суд РБ не можа ісці на парушэнні міжнароднага права і не можа не ўлічваць інтарэсы Міжнароднага літфонду (правапераемніка Літфонду СССР), сузаснавальнікам якога з'яўляецца ГА "Беллітфонд" і ў склад якога ўваходзяць больш за пятнаццаць пісьменніцкіх Літфондаў краін былога СССР і Еўропы"*, — гаворыцца ў звароце.

Праўленне "Беллітфонду" настойліва просіць запатрабаваць з Вярхоўнага суда справу па ліквідацыі арганізацыі, вынесці пратэст на згаданае судовае рашэнне і накіраваць справу на новы разгляд.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Зорныя дні Ганны Кутузавай

"У нас адзін шлях" — так назвала свой твор 11-гадовая полацкая гімназістка Ганна Кутузава, удзельніца аб'яўленага Дзярждэпартаментам ЗША міжнароднага конкурсу дзіцячага малюнка на тэму *"Што для вас з'яўляецца галоўным у навакольным асяроддзі"*. З тысяч дасланых па электроннай пошце дзіцячых твораў журы адабрала 40 малюнкаў з Беларусі. Аўтарамі 12-ці з іх былі жыхары Полацка, вучні адной гімназіі. Пераможцай стала Ганна Кутузава. На яе яскравым малюнку адлюстраваны зямны шар, на якім у адным напрамку крочаць ногі дзяцей у рознакаляровых штанішках. Так дасціпна юная мастачка выказала сваю мару аб тым, каб усе людзі Зямлі жылі дружна.

Узнагародай для пераможцы конкурсу і яе мамы стала падарожжа ў ЗША з наведваннем Дыснейленду, Вашынгтонскага заапарка ды іншых цікавых месцаў. А нядаўна Полацкую дзяржаўную гімназію №1, дзе вучыцца Ганна Кутузава, наведала дэлегацыя амбасады ЗША ў Беларусі на чале з аташэ па культуры **Джэймсам Лэндам.** Кіраўніку дэлегацыі перш-наперш давялося правесці своеасаблівы майстар-клас англійскай мовы для вучняў настаўніцы **Наталлі Нялюбавай**. А потым госці дэталёва знаёміліся з умовамі навучання дзяцей у гімназіі. Амерыканцы выказалі захапленне ўзроўнем выхавання юных талентаў. Асабліва шмат цёплых слоў пачула ад замежнікаў настаўніца выяўленчага мастацтва Святлана Рамашка, вучні якой бралі ўдзел у міжнародным конкурсе, а Ганна Кутузава стала ў ім першай.

Супрацоўнікі амбасады ЗША ўручылі ад імя Дзярждэпартамента сваёй краіны падарункі не толькі Ганне Кутузавай, але і ўсім астатнім удзельнікам конкурсу.

А пераможца міжнароднага спаборніцтва юных мастакоў пачала працаваць над вялікай серыяй маляваных уражанняў ад паездкі за акіян.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

СКАНДАЛ

Купалаўцаў папрасілі размаўляць цішэй

У адказ яны паскардзіліся на абслугоўваючы персанал кавярні “Бамонд”

Выхаванасць — рэч яўная. Яе адсутнасць заўважаецца адразу. Тым больш гэта датычыцца асоб публічных, бо яны заўжды на вачах.

Днямі кампанія маладых акцёраў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра наведалася ў кавярню “Бамонд”, якая месціцца ў адным памяшканні з Малой сцэнай Купалаўскага тэатра. Тэатр для любога акцёра — родны дом. Таму маладыя людзі і паводзілі сябе там, як дома. Бармен, якая абслугоўвала акцёраў, асмелілася зрабіць слугам Мельпамены заўвагу — вельмі ўжо гучна яны размаўлялі і смяяліся... Гэта выклікала абурэнне ў актрысы **Вікторыі Чайлытка**. Яна палічыла, што заўвагі бармена псуюць яе адпачынак і запатрабавала кнігу скаргаў. Яе просьба была выканана. Скарга ўмясцілася на двух аркушах. Пад пасланнем таксама стаяць подпісы **Міхаіла Зуя, Ганны Хітрык** і іншых. Пад сваімі прозвішчамі яны горда напісалі *“купалаўцы”*. Расказваюць, што калі ў “Бамонд” прыйшоў абедаць дырэктар Купалаўскага тэатра **Мікалай Кірычэнка**, яму адразу паказалі літаратурную творчасць ягоных падначаленых. Кажуць, Кірычэнка нават пачырванеў...

Тым не менш адміністрацыя “Бамонду” ў адпаведнасці з заканадаўствам накіравала на імя Вікторыі Чайлытка адэкватны адказ. У ім, у прыватнасці, паведамляецца: *“Адміністрацыя кавярні прыносіць Вам свае прабачэнні за зробленую абслугоўваючым персаналам заўвагу ў ваш адрас. Пры гэтым просім улічыць, што ў нашай установе, як, дарэчы, і ў любой іншай грамадскай установе, не прынята гучна размаўляць, каб не перашкаджаць іншым наведвальнікам адпачываць, а персаналу працаваць”.*

Дарэчы, персанал кавярні яшчэ раз праінструктаваны аб тым, што заўвагі трэба рабіць карэктна. У прынцыпе, так яно было і ёсць. У кнізе скаргаў 99 працэнтаў запісаў удзячнасці. Канфлікт з купалаўцамі — адзінкавы выпадак.

У гэтым кантэксце хацелася б адзначыць, што сярод купалаўцаў бываюць розныя людзі. Наўрад ці **Марыя Захарэвіч, Аўгуст Мілаванаў, Арнольд Памазан** і іншыя старажылы тэатра маглі б дазволіць сабе спрачацца з персаналам кавярні і перашкаджаць адпачываць іншым.

Леанід ЯГОРАЎ.



БЛІЦ

А вам даводзілася калі-небудзь патрабаваць кнігу скаргаў?

Аляксандр КУЛЛІНКОВІЧ, лідэр гурта “Нейра Дзюбель”:

— Не, не даводзілася. Я ўвогуле лічу, што кніга скаргаў — рэч непатрэбная. Гэта як фількіна грамата. Мне здаецца, што карыстаюцца ў асноўным скандалісты альбо людзі з нейкімі псіхічнымі адхіленнямі. Альбо наадварот — патрэбна гаспадару магазіна ці кавярні, каб яго ўстанову пахвалілі, дык ён можа свайго сябра аб гэтым папрасіць, і той напіша, што ў магазіне самыя смачныя і танныя прадукты. Хаця насамрэч у гэтай краме тухляцінай гандлююць...

Алена РЫБАКОВА, прадпрымальнік:

— Я з’яўляюся ўладальніцай невялічкай крамы. Там ёсць кніга скаргаў і прапаноў, дзе, шчыра скажу, ёсць не зусім станоўчыя водгукі. Адна з маіх супрацоўніц не вельмі ветліва абышлася з ветэранам вайны. Той пакінуў запіс у кнізе скаргаў. На заўтра, разабраўшыся ў сітуацыі, я была вымушана звольніць дзяўчыну. Так што кніга скаргаў — гэта як падказка для кіраўніка. Бо ў сваёй дзейнасці я карыстаюся старой, але праверанай догмай: “Пакупнік заўжды мае рацыю”. І ў 95 працэнтаў выпадкаў так яно і ёсць.

Пётр РАБУХІН, прэс-аташэ Нацыянальнага алімпійскага камітэта:

— Бывалі такія выпадкі, калі б і трэба было ёю скарыстацца, але я мяккі чалавек, умею дараваць. Лічу, што кніга скаргаў і прапаноў — рэч патрэбная. Гэта своеасаблівы стрымліваючы інструмент. Ён дазваляе разлічваць, што спажывец у нейкай ступені застрахаваны ад хамства з боку ўладальнікаў той ці іншай установы. У выпадку стварэння канфліктнай сітуацыі гаспадар рэстарана ці крамы заўжды помніць пра наяўнасць гэтай кнігі... І запіс негатыўнага характару можа пашкодзіць...

Віталь КАРПАНАЎ, саліст гурта “Дразды”:

— Не, ніколі. Мне гэта не патрэбна. Проста я па натуры вельмі добры чалавек.

Алена СТАЦЭНКА, актрыса Рускага драматычнага тэатра імя М.Горкага:

— Так. Аднойчы я скарысталася кнігай скаргаў у адной з мінскіх крамаў. Замест таго каб адказаць на мае пытанні датычна кошту пакупкі, прадаўшчыца травіла байкі са знаёмым. На маю просьбу звярнуць на мяне ўвагу жанчына адказала адборнай лаянкай. Натуральна, мяне гэта абурыла. І я запатрабавала кнігу скаргаў. Праўда, мне яе так і не далі, сказалі, што яе некуды забралі на пераафармленне.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ, пісьменнік:

— Не, не даводзілася. Можа быць, гэтыя кнігі камусьці і патрэбныя... Але калі кожны будзе рабіць сваю справу добра, то ў гэтых кнігах ніякай патрэбы не будзе...

Галіна ЗАБУР’ЯНАВА, загадчыца сектара развіцця турызму Кіраўніцтва справамі прэзідэнта:

— У мяне ніколі такой неабходнасці не ўзнікала. Але я думаю, што кніга скаргаў патрэбная. Падчас здараецца, што іншай магчымасці зняць праблему няма...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ШОУ-БИЗНЕС

Владимир Кубышкин не хочет покрываться плесенью

Поэтому уже в третий раз устраивает презентацию некоммерческого музыкального диска “Союз”.

По словам организаторов, на вечеринке по случаю презентации должны были присутствовать такие “мегазвезды” белорусского шоу-бизнеса, как **Лариса Грибалева, Corriana, Алексей Хлестов, Галина Шишкова, группа “Черника”**. Несмотря на то, что композиции всех этих исполнителей есть в альбоме, на презентацию пришли единицы... А на вопросы журналистов отвечал продюсер альбома **Владимир Кубышкин.**

По его словам, *“альбом ”Белорусский музыкальный Союз” занял достойное место на белорусском музыкальном рынке”.*

“Но это не коммерческая акция, — сказал Кубышкин. — *Мы просто собираем лучшее, что сделали наши белорусские артисты за определенный отрезок времени. Это дает возможность слушателям за приемлемую цену приобрести любимые композиции. Но главной идеей этого сборника является продвижение белорусских исполнителей в нашем медиа-пространстве. Можно сказать, что ”Союз” — это конкретный вклад в продвижение качественной белорусской музыки. В сборник попадают только самые лучшие, раскрученные и ротируемые композиции”.*

По мнению Кубышкина, многие композиции из нового альбома *“достойны ротироваться не только по странам СНГ”.*

Однако подобные проекты, говорит Кубышкин, не окупают себя.

“Вложенные деньги мы вернем, — полагает продюсер. — *Но, судя по продажам двух предыдущих альбомов, о прибыли говорить не приходится. Но если вообще ничего не делать, то плесенью покроемся...”*

Дмитрий БОБРОВСКИЙ.

НОВАЕ ІМЯ

Новы свет Андруся Такіданга

У мінулым годзе я бачыў яго на Плошчы Каліноўскага, калі моладзь бараніла намётавы гарадок. У многіх яго з’яўленне выклікала шчырае здзіўленне: цёмнаскуры юнак размаўляў па-беларуску. Але нічога дзіўнага ў гэтым насамрэч не было. Саліст гурта “Рэха” Андрусь Такіданг, як ні дзіўна, карэнны мінчанін. І на беларускі “майдан” ён прыходзіў па закліку сэрца. Каб падтрымаць сяброў і падыхаць паветрам свабоды...

— Я нарадзіўся і вырас у Мінску, — расказвае Андрусь. — З самага дзяцінства я чуў беларускую мову. На ёй вельмі добра размаўляе мая маці. І ў тым, што я на ёй спяваю і размаўляю, нічога дзіўнага няма.

— Задам банальнае пытанне. Чаму ты ў мінулым годзе выйшаў на Плошчу Каліноўскага?

— Каб быць побач з аднадумцамі. Перажыць разам усё тое, што нас чакала. Там было добра і вольна. Шкада, што ўсё скончылася так, як скончылася. Але добра і тое, што свабоднымі хочуць быць дзесяткі тысяч маладых людзей. А за моладдзю — будучыня.

— Так сталася, што сёння ў Беларусі беларуская мова лічыцца “эміграцкай”. Творы лепшых беларускіх літаратараў выкідаюцца са школьнай праграмы, зачыняюцца беларускамоўныя класы... На тваю думку, чаму беларусы дазваляюць гвалціць родную мову?

— Мне цяжка адназначна адказаць. Напэўна, справа тут нават не ў менталітэце. Разумееш, кожны робіць свой выбар сам. Калі ты хочаш размаўляць на беларускай мове, то ты будзеш на ёй гаварыць, думаць, пісаць. Мова — яна ўсё роўна перажыве ўсіх.

— Памятаеш, калі напісаў сваю першую беларускую песню?

— Даўно. Але да пэўнага часу пісаў песні для сябе. А потым з’явілася жаданне і магчымасць стварыць музычны калектыў. Так і з’явілася “Рэха”.

— Наколькі я ведаю, ты вучышся на мастака. Чаму вырашыў яшчэ і спяваць?

— Каб самавыявіцца. Мастак і музыка — творцы. Але, як ты разумееш, сродкі перадачы пачуццяў у іх розныя. Тое, што можна перадаць словам, не заўжды можна адчуць, гледзячы на карціну. Таму я і вырашыў дадаць да свайго мастацкага “Я” яшчэ і музычную творчасць.



— Ёсць меркаванне, што сапраўдны творца заўжды ў пошуку. Чаго шукаеш ты?

— Каб ведаў адказ на гэтае пытанне, не пісаў бы нічога. Я рамантык у душы і таму сваімі песнямі стараю свет, у якім хацелася б жыць мне і, напэўна, кожнаму. Новы свет без зла і болю, без сквапнасці і хлусні...

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ

«Изюмительный пленэр»

Так называется совершенно новое направление ресторанной ве черней программы столичного клуба “Изюм”, в основе которой лежит пропаганда высокого искусства.

“Среди клубов и ресторанов постоянно происходит ”борьба" за инновации в интерьере, — *говорит директор ресторана-клуба “Изюм” Наталия Жук.* — Мы ведь прекрасно понимаем, что эстетическая составляющая отдыха не менее важна, чем изыски кухни и профессиональное обслуживание. Рассуждая о том, что лучше подчеркнет имидж заведения, мы пришли к идее организации своеобразных салонов, форумов для демонстрации достижений белорусских деятелей искусства. Ведь мы можем подобрать такие картины для экспозиции, которые гармонично будут выглядеть в нашем интерьере и радовать наших гостей".

Наталья утверждает, что проект не будет ограничиваться только белорусскими авторами. Хотя именно соотечественникам будет уделяться особое внимание.

“Вы где-нибудь еще видели, чтобы в ресторане висели картины известных художников, причем в оригинале? — *продолжает Наталия Михайловна.* — А мы это сделали. Картины известного художника **Владимира Цеслера** будут украшать наш ресторан еще месяц. После чего вас ждут иные экспозиции, и, соответственно, новые концепции арт-вечеров. Каждая концепция предусматривает новинки от шеф-повара и барменов, изменение музыкального формата, стильные аксессуары, украшающие интерьер. При этом всегда неизменными остаются наши требования к качеству и обслуживанию”.

***Владимир Цеслер** горд тем, что он — первооткрыватель нового клубного движения.*

“Я не искусствовед — мне рассказывать нечего, — скромно говорит Цеслер. — Все, что я хочу сказать, написано на моих картинах. Что же касается популяризации творчества белорусских художников, то я действительно рад тому, что появилась ниша, где таланту можно представить свои работы. Проект ”Изюмительный пленэр" — прикольный, и я горжусь, что именно меня позвали на открытие этой глобальной штуки".

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Рок ізноў за «Баброў»

У Бабруйску прайшоў традыцыйны фестываль рок-музыкі “Рок за Баброў”

Гэта мерапрыемства ў Бабруйску адбылося ў трэці раз. Удзел у сёлетнім фестывалі бралі вядомыя рок-калектывы краіны. Сярод іх гурты “Стая”, “ТТ-34", J_Mors, ”Ляпис Трубецкой"і іншыя.

За гады свайго існавання “Рок за Баброў” зрабіўся знакавай падзеяй. З Мінска ў Бабруйск выехалі тры камфартабельныя аўтобусы, бітком забітыя ці то аматарамі піва, ці то аматарамі рокавай музыкі. У двух з іх — VIP-госці, у трэцім — прадстаўнікі СМІ.

Першы пункт культурна-забаўляльнай праграмы ў Бабруйску — наведванне мясцовага піўзавода, які і вырабляе піва “Баброў”. Зайшоўшы на прахадную, я чакаў убачыць усё што заўгодна — чучала бабра з пляшкай піва ў лапах, інфармацыю пра гісторыю завода... Але ўбачанае пераўзышло ўсе чаканні. Пераступіўшы парог прахадной, кожны наведвальнік нос у нос сутыкаўся з Аляксандрам Лукашэнкам у белым халаце. Засяроджаным позіркам кіраўнік краіны глядзіць на канвеер з піўнымі бутэлькамі...

Зараз на бабруйскім заводзе працуюць дзве лініі па вытворчасці піва: нямецкая і італьянская. У цэху, дзе бесперабойна працуе канвеер, суправаджаючая гучна папярэджвае: *“Піва рукамі з канвеера не выхопліваць, гэта можа прывесці да спынення вытворчасці...”* І дадае, што ўздзеянне чалавечага фактару на вытворчасць зведзена да мінімуму: *“Працэс вырабу піва цалкам аўтаматызаваны, за працэсам назіраюць і ўсё кантралююць аператары. І штат на заводзе адносна невялікі”.*

На бабруйскім піўзаводзе — звышсучасная лабараторыя. Тут робяць усялякія “піўныя аналізы”. На яе абсталяванне было затрачана 300.000 еўра.

“Увогуле, мы арыентуемся на еўрапейскія стандарты якасці піва. Нашы беларускія ”госты" не зусім жорсткія...” — сказала нам экскурсавод. Дарэчы, пакаштаваўшы піва, якое толькі-толькі сышло з канвеера, злавіў сябе на думцы, што яно смачнейшае за тое, якое прадаецца ў крамах. А можа, проста падалося...

...Рок-фестываль праходзіў ля мясцовага Палаца культуры. Ён сабраў ад пяці да васьмі тысяч чалавек. Пра маштаб папулярнасці музыкаў можна было меркаваць у тым ліку і па аўтатранспарце, на якім яны дабіраліся да Бабруйска. “Ляпісы”, напрыклад, прыехалі на вялікім “неаплане”, а гурт ТТ-34 — на звычайным мікрааўтобусе. Дарэчы, “забіваючы” час да пачатку свайго выступлення, адзін з удзельнікаў гурта “ТТ-34" вырашыў сфатаграфавацца на памяць з міліцыянтам, які стаяў у ачапленні. Чалавек у форме спачатку здзівіўся, потым разгубіўся і ў рэшце рэшт знайшоў што адказаць: *”Нам не положено".*

Хед-лайнерамі “Рок за Баброў” на гэты раз выступіў гурт “Ляпис Трубецкой”. Сяргей Міхалок, як заўжды, быў на вышыні. Пасля гадзіннага выступлення ён цярпліва раздаваў аўтографы. Мужчына, напіўшыся піва, падбег да турнікета і закрычаў: *“Сярога, распішыся мне на спіне. Я ж месяц мыцца не буду...”* Міхалок просьбу задаволіў. За ім да Міхалка прарваўся, хістаючыся ці то ад “перапою”, ці то ад слабасці дзяцюк у адных шортах і папрасіў у Міхалка: “Падары мне майку”. Сяргей не разгубіўся і адказаў: *“Ты і так з ног да галавы апрануты, навошта табе і майка яшчэ”.* На тым яны і развіталіся...

Апагеем фестывалю стаў пяціхвілінны феерверк з воклічамі “Рок за ”Баброў!". Варта адзначыць, што ў планах арганізатараў правядзенне падобнага фэсту ў будучым годзе.

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фотя Сяргея ЧАРВЯКОВА.

ДЭБЮТ

Каця ПЫТЛЕВА: «Майму мужу падабаюцца не ўсе песні «Клёндайка»

Днямі ў сталічным клубе “Класік” адбылася прэзентацыя дэбютнага альбома гурта “Клёндайк” “Разное время”.

“За апошні час мы пасталелі, — прызналася салістка гурта Каця Пытлева. — *У тым ліку і ў творчасці. Гурт ”Клёндайк” заўважна “пацяжэў” і канчаткова пазбавіўся ад прыстаўкі “поп” у вызначэнні сваёй творчасці”.*

Дарэчы, Каця не вельмі любіць, калі “Клёндайк” атаясамліваюць выключна з яе персонай.

“Клёндайк” — гэта цэлы гурт выдатных музыкантаў. А я там проста спяваю", — кажа Пытлева.

Што да самога альбома “Разное время”, то ў яго ўвайшлі 11 кампазіцый, а назва была прыдумана абсалютна выпадкова.

“Назва кружэлкі мне падаецца цалкам лагічнай, — тлумачыць Каця. — *Песні, якія сюды трапілі, прадстаўляюць розныя перыяды майго жыцця, яны блізкія, на мой погляд, кожнаму — перажыванні, пошукі, пачуцці, у тым ліку і пачуццё адзіноты. Песні пішуцца, калі я, калі можна так выказацца, стаю на краі”.*

І тут жа ці то сур’ёзна, ці то паўжартам салістка “Клёндайка” дадала: *“Напрыклад, майму мужу падабаюцца не ўсе творы нашага гурта, але песні, якія ўвайшлі ў ”Разное время", прыйшліся яму даспадобы".*

“Клёндайк” — праект, удзельнікі якога не ставяць перад сабой задачу зарабляць гэтым грошы.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ФУТБОЛ

Пунтус папрасіў прабачэння ў балельшчыкаў

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе Юрый Пунтус папрасіў прабачэння ў балельшчыкаў пасля пройгрышу нашай зборнай у матчы з балгарамі.

"Вельмі крыўдна, вельмі шкада і трошачкі нават сорамна перад балельшчыкамі. Хачу папрасіць прабачэння за тое, што згулялі дрэнна, тым больш дома, пры такой колькасці гледачоў", — сказаў трэнер на прэс-канферэнцыі пасля заканчэння сустрэчы.

Ю.Пунтус прызнаўся, што быў здзіўлены гульнёй гасцей. "Балгары мяне здзівілі. Я цудоўна разумеў, што гэта грозная каманда з лідэрамі Бербатавым (выступае за англійскі "Тотэнхэм") і Марцінам Петравым ("Атлетыка", Мадрыд), але тое, што я на свае вочы ўбачыў, мяне проста здзівіла. Па-першае, хуткасць, падрыхтаванасць і, галоўнае, асабліва гэта тычыцца Бербатава, тэхнічная аснашчанасць, моц такая", — сказаў Ю.Пунтус.

"Балгары ў кожным моманце былі хутчэйшыя, яны нас "накрывалі", вымушалі памыляцца", — канстатаваў трэнер беларускай каманды. Ю.Пунтус паскардзіўся на тое, што, насуперак яго ўстаноўцы больш выкарыстоўваць флангі, ігракі імкнуліся прарвацца да чужых варот праз цэнтр. "Там балгары гулялі ў тры апорныя паўабаронцы, мелі перавагу, а мы чамусьці лезлі на гэтую сцяну і імкнуліся там знайсці шчасце", — сказаў Ю.Пунтус. Паводле яго слоў, у перапынку была ўпэўненасць, што ў другім тайме ўдасца змяніць ход падзей, але рэалізацыі планаў перашкодзіў хуткі гол Д.Бербатава.

Юрый Пунтус патлумачыў сітуацыю з абаронцам Сяргеем Амельянчуком, які на 72-й хвіліне не пагадзіўся з рашэннем замяніць яго на паўабаронцу Алега Страхановіча і не хацеў пакідаць поле. "Мне таксама непрыемна, — сказаў Ю.Пунтус. — Я замяніў яго не таму, што ён слаба гуляў. Ён атрымаў другую жоўтую картку і прапусціць наступны матч. Самае галоўнае, я пайшоў ва-банк, 0:2 прайгравалі. Была дылема: пакінуць на полі яго ці Коўбу. Гэта чыста трэнерская стратэгія. Свая кашуля, так бы мовіць, бліжэйшая: футбалісты ў такіх сітуацыях трохі эгаістычныя. Яны думаюць больш пра сябе, не пра каманду, не пра трэнера. Сярожа, напэўна, астыне, зразумее гэта. Я яму па гарачых слядах растлумачыў".

Паводле слоў трэнера, пасля матчу ў раздзявальні ён не сказаў ігракам ніводнага слова: "Я глядзеў збоку як бы на тое становішча. Яно было спакойнае, практычна ніхто не размаўляў. Я не бачу ў такой сітуацыі патрэбы нешта казаць. Заўтра, безумоўна, мы пагутарым, усе гэтыя моманты разбяром".

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ОТКРОВЕННЫЙ РАЗГОВОР

Ассоль СЛИВЕЦ:

«Мой Грэй мчал ко мне на всех парусах...»

За пару дней до свадьбы серебряная призерка чемпионата мира по фристайлу Ассоль СЛИВЕЦ пооткровенничала с корреспондентом «Народной воли»

...Ее джип "Хонда" украшен с тыльной стороны огромной ромашкой. В ее волосах — цветы, а может быть — бабочки, и вся она — такая возвышенная, солнечная и жизнерадостная — напоминает мне ее тезку из гриновских "Алых парусов".

— Так я же и есть возвышенная, — заливисто смеется Ассоль, пока мы прогуливаемся по набережной Свислочи. — Знаешь, как во фристайле высоко приходится взлетать!

— А еще я слышал, что ты могла стать выдающейся скрипачкой.

— Конечно, могла, если учесть, что дома у меня была декоративная скрипка, — ее глаза снова улыбаются. — Хотя нет, давай серьезно, к музыке-то я никогда никакого отношения не имела. Как с детства меня и Тимку *(тоже фристайлист — Тимофей Сливец —* **Авт.***)* родители отдали в спорт, так все время по жизни со спортом и иду. Плавание, водные лыжи... Музыка сюда никак не вписывалась, к тому же мама жутко ненавидела музыкальную школу, в которую в свое время ее заставляли ходить.

— То есть фристайл — это судьба...

— Скорее всего да. С высоты прожитых лет понимаешь, что не могло не сложиться так, чтобы меня тогда не отдали в балет на воде. Что может быть красивее для девочки? Правда, это счастье через полгода закрылось, и я перешла на батут. И опять-таки — разве не интересно детям кувыркаться? Да и Тимка, как младший, был под присмотром.

— Нужен был присмотр?

— Ой, мы столько ругались, когда не могли чего-нибудь поделить, что лучше не вспоминать. Тарелки, подушки, игрушки — все делили. Но это же детство. Сейчас он мой очень хороший друг.

— Кто с большим удовольствием тренировался?

— Наверное, одинаково. Это ж такой спорт веселый, особенно для детей. Это в гимнастике с утра до вечера надо пахать в зале, а здесь все более занятное. На лыжах в воду прыгали — тоже своеобразный кайф.

— Во фристайле страшно не было?

— Маленькой — нет, тем более что прыгать сальто — ничего сложного. Но вообще страх — это нормальное явление.

— Страх бывает в какой момент?

— У меня — когда резко меняется погода, и ты не можешь просчитать все варианты. Изменяются направление ветра, температура снега, и вот здесь иногда действительно бывает страшно. Но лишь иногда. На Олимпиаде, например, был сильный туман, но для меня это не было помехой. А бывает немотивированный страх, когда он, как заноза, заседает где-то в подкорке мозга.

— Родители твои нормально относятся к тому, что занимаешься таким экстремальным видом спорта?

— Мама не смотрит мои выступления вообще. Или же в записи, по прошествии времени. Смотреть на дочку на соревнованиях — на это, как она говорит, у нее нервов не хватает.

— Соля, после того как случилось несчастье с Дмитрием Раком, психологически тяжело было идти на трамплин?

— Честно говоря, мы до последнего не верили, что все так серьезно. Это произошло на разминке, мы к тому времени уже отсоревновались и сидели в гостинице. Я и все девочки самого происшествия не видели. Мы увидели Диму только тогда, когда его уже реанимировали. Это было страшно, но казалось, что сейчас он придет в сознание и все будет нормально. С фристайлистами такое случается где-то раз в год, но бессознательное состояние обычно длится 15—20 секунд. Если что-то совсем серьезное, то прилетает вертолет и увозит. Дима Дащинский тогда поехал в больницу. Не верилось, что на ровном месте все может быть настолько серьезно.

— Ничего себе — "на ровном месте"...

— Понимаешь, я считаю, что не было такого, что Дима упал и именно этот удар стал причиной такой серьезной травмы. Возможно, все это накапливалось со временем. Как инсульт. Такое может случиться с любым спортсменом в любой момент... Кстати, сейчас мы проводим акцию "Спортсмены — в помощь Дмитрию Раку". Диме нужны деньги на лечение в московском реабилитационном центре на восстановление речи и прикладных навыков. Обещают выделить деньги Министерство спорта и НОК, но их все равно не хватает.

— Много не хватает?

— Около четырех тысяч долларов. Уже дали деньги хоккеисты, гимнастки, Наташа Цилинская, Юля Нестеренко... Все отнеслись с пониманием. И дело даже не в деньгах — беда ведь может случиться (тьфу-тьфу-тьфу) с каждым. Я тоже падала, меня тоже увозили в бессознательном состоянии, но обошлось. Помню — прыжок, падение, а дальше — ничего не помню. Открываю глаза — люди в белых халатах.

— Дилетанты утверждают, что у всех фристайлистов на "пятой точке" — мозоли?

— Глупости какие-то! Извиняюсь, на попу мы вообще редко приземляемся. Бывает, когда сильно перекрутишь, то можно зацепиться о землю спиной, но на спину надевается "черепашка", которая смягчает удар. Парни вообще никак не защищают себя, считают, наверное, что у них и так спины сильные.

— Соля, я так понял, фристайл — достаточно ответственный вид спорта, который вырабатывает в спортсмене самостоятельность и индивидуальность. Надеяться-то приходится только на самого себя, правильно?

— Нет, есть же еще тренеры, которые все время тебя "координируют" во время прыжка, но то, что я рано стала самостоятельной, — это правда. И насчет индивидуальности — этого, простите за нескромность, не отнять. Не люблю стадность. Помню, пришла однажды в БРСМ их устав посмотреть, надо было, помоему, для экзамена...

— *Фе,* — брезгливо отворачивается моя собеседница, увидев, как рыбак насаживает на крючок червяка. — *Не люблю рыбалку, потому что там надо червяка в руке держать — толстого, шершавого, извивающегося...*

— Мы отвлеклись от БРСМ...

— Да, так вот пришла просто устав их посмотреть, а они мне в рукав вцепились — вступай в организацию, и все тут. Так и держали за рукав, пока бежала к двери. Ну не хочу я ходить строем, как им было это объяснить? Не хочу быть как все, не хочу вступать куда-то только потому, что туда все вступают. И дело здесь не в БРСМ, просто не люблю стадность. С точки зрения государственной идеологии я, наверное, не очень сознательный гражданин, которым тяжелее управлять, но тут уж ничего не поделаешь. Хотя, с другой стороны, я также не люблю и трепачей, которые только и умеют, что ругать, но сами ничего толкового и полезного в этой жизни не сделали. Вот они говорят, например: уеду за границу, там мне будет хорошо. Так и за границей им хорошо не будет, если они будут сидеть на диване и смотреть телевизор.

— Сама-то ты начала ездить за границу рано.

— Так это мама нас возила на машине на отдых в Болгарию, Турцию. А вообще, мне нравится отдыхать в Испании. Очень дружелюбные люди, чистое красивое море, доступный, ненавязчивый сервис. Понравился серфинг на острове Бали в Индонезии — жаль только, что двенадцать часов лететь надо.

— А дома как отдыхаешь?

— Первую неделю, когда приезжаю домой после всяческих сборов и соревнований, — просто сплю днем, потому что ночью в период акклиматизации брожу с Тимофеем по квартире. Отдых зависит от того, насколько устала.

— В этом году ты уже стала серебряным призером чемпионата мира, июнь тоже обещает стать для тебя памятным...

— Что есть, то есть! Представляешь, 7 июня у меня защита диплома в Академии физвоспитания, 9 июня — свадьба, а 22 июня — День рождения. Три в одном!

— О свадьбе давай, если не против, поподробнее.

— Суета сует, что там рассказывать. То да сё, платье еле выбрала... Ходишь, смотришь, вроде и выбор большой, и красивые все, а присмотришься — не то. Но выбрала. Жениху-то нельзя платье невесты до свадьбы видеть, а вот костюм Сергею выбирали вместе. Неплохой такой купили, светленький.

— Свадьба большая будет?

— Нет, совсем небольшая — человек 50. Можно было, конечно, и с конями веселье отгрохать, и гостей пригласить человек под двести, но соль-то семейного счастья все же, наверное, не в этом. Уверена, что я не стану счастливее, если приеду в загс на белом лимузине. У нас тоже будет кортеж машин, но еще радостнее, что приедут самые близкие друзья. Швейцарская и канадская подружки, фристайлистка из Москвы Даша Серова будет первой свидетельницей. Может быть, на свадьбе выступят некоторые наши белорусские артисты. Одним словом, подготовка идет полным ходом, подозреваю, что на самом мероприятии нам приготовили, коль я Ассоль, и алые паруса. Кстати, Сергея часто называют Серым, а серый по-английски — это "грэй". Ассоль, как известно, ждала Грэя — все как у Грина.

— Жених-то как к тебе приплыл в свое время?

— Давно познакомились, он детский тренер по конькобежному спорту.

— Соля, а что тяжелее — скажем, Олимпиаду выиграть или замуж выйти?

— Ой, ну ты и сравнил! Выйти замуж, по-моему, вообще особого ума не надо. Хотя, не в обиду будет сказано девушкам, но запросы у многих не соответствуют предложениям и доходам. Я смотрю недавно: девушка платье выбирает, явно студентка, скромненько одетая, парень рядом с ней — видно, что тоже студент. Но платье она хочет за 800 долларов! Боже ты мой, думаю, неужели платье за 800 долларов сделает тебя счастливее?

— А ты за сколько выбрала?

— За 350, но продавщица узнала меня и сделала скидку на 50 долларов. И вообще, я шила платье на заказ. Белое платье с розовеньким бантиком, не слишком широкое, чтобы не ходить, как кукла, — к Сергею не дотянешься поцеловаться.

— Кольца покупали или заказывали?

— Заказывали у ювелира. В наших минских салонах почему-то так получилось, что если есть колечко, которое мне нравится, то нет для Сергея. Если есть мужские, то женские не подобрать. Одним словом, мы решили заказать кольца по своему эскизу у знакомого ювелира. Из белого и желтого золота. Инь и Янь, мужское и женское начала. У меня в колечке есть один бриллиантик.

— В свадебное путешествие куда отправитесь?

— Хотим в Париж, но только в августе. Сейчас должны поехать на сборы в Швейцарию.

— После свадьбы о пополнении в семье не собираетесь подумать?

— Пока рано об этом говорить — все-таки мне еще надо попрыгать. Для знакомых фристайлистов из Швейцарии вообще дико, что я выхожу замуж в 25 лет. Они сочетаются браком лет в 30, только в 32 и позже обзаводятся детьми. Но я считаю так — сердцу не прикажешь. И главное, чтобы люди любили друг друга, — остальное приложится.

Алесь СИВЫЙ.
Фото автора.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

У адказ на блакаду — працягніце «Народнай воле» руку дапамогі!

Скажам шчыра: з дня на дзень мы чакалі адмены рэпрэсій з боку ўлады. Чакалі весткі, што "Народная воля" далей можа друкавацца ў беларускіх друкарнях, свабодна распаўсюджвацца па падпісцы і праз шапікі.

Але на момант адпраўкі нумара ў друк ніхто не патэлефанаваў, ніхто не абрадаваў.

Што ж, шаноўныя чытачы, будзем разам змагацца за вызваленне, за лёс "Народнай волі". У каторы раз паўтараем: пакуль улады не знялі блакаду, дзейнічаем так, як і дзейнічалі — друкуемся ў Смаленску, распаўсюджваем газету ўласнымі сіламі. Хто яшчэ не зрабіў **перадаплату** за чэрвеньскія нумары — калі ласка, зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. З такой просьбай рэдакцыя звяртаецца і да тых, хто запазычыўся, г.зн. у маі атрымліваў газету авансам. Шкада, але, калі Вы не падтрымаеце "Народную волю", нам, паўтараем, давядзецца развітацца.

Дарэчы, ужо можна рабіць **перадаплату** і за другое паўгоддзе. Не маеце магчымасці заплаціць за нумары ўсіх шасці месяцаў — зрабіце **перадаплату** за любы тэрмін: за месяц, два, тры...

Для тых, хто ўпершыню хоча стаць нашым чытачом, патлумачым: аформіць **перадаплату** можна ў любы дзень. Як толькі нам стане вядома, што Вы заплацілі грошы, праз 2—3 дні атрымаеце свежыя нумары газеты. Таму хутчэй у любы філіял "Беларусбанка" альбо на пошту!

Заадно ў чарговы раз паўтараем нашу настойлівую просьбу: агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна нават да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами и обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА

Рэкордны чэмпіянат

У Брэсце на Міждзяржаўным турніры па цяжкай атлетыцы ўстаноўлена 11 рэкордаў рэспублікі. У спаборніцтвах узялі ўдзел больш за 80 атлетаў з усіх абласцей Беларусі, Мінска, а таксама Расіі і Польшчы.

Як паведаміў БелаПАН галоўны суддзя турніру Аляксандр Самадаеў, дзевяць рэспубліканскіх рэкордаў у вагавай катэгорыі да 53 кг устанавіла 25-гадовая майстар спорту міжнароднага класа, удзельніца Алімпійскіх гульняў і прызёр першынства Еўропы Анастасія Новікава: па тры ў рыўку з вынікам 91 кг, па тры ў штуршку з вынікам 111 кг і па тры па суме дваябор'я з вынікам 202 кг. Аўтарам яшчэ двух рэкордаў (у рыўку 84 кг і па суме дваябор'я) стала 17-гадовая выхаванка Брэсцкага вучылішча алімпійскага рэзерву Ірына Мішчук (вагавая катэгорыя да 58 кг). Яе вынік — 178 кг. У вагавай катэгорыі да 63 кг па суме дваябор'я першынствавала Іна Палуянава з Гомельскай вобласці (вынік 165 кг), да 69 кг — Святлана Сідарэнка з Мінскай вобласці (вынік 180 кг), да 75 кг — прадстаўніца Брэсцкай школы вышэйшага спартыўнага майстэрства Ірына Кулеша (вынік 216 кг).

У спартсменак вагавай катэгорыі больш за 75 кг на вышэйшую ступеньку п'едэстала гонару ўзнялася 18-гадовая выхаванка Магілёўскага вучылішча алімпійскага рэзерву Юлія Наваковіч (228 кг).

У мужчын залаты медаль быў ўручаны брэстаўчанину Аляксандру Касенюку, які выканаў на гэтых спаборніцтвах нарматыў майстра спорту (вагавая катэгорыя да 62 кг, вынік — 235 кг). Пераможцам турніру таксама стаў Шарапутдзін Курбанаў (Сургут, Расія). Самы старэйшы па ўзросце, 35-гадовы расійскі спартсмен выступаў у вагавай катэгорыі да 69 кг і перамог з вынікам 262 кг. У вагавай катэгорыі да 77 кг выйграў магіляўчанін Міхаіл Баркоў (339 кг), до 85 кг — мінчанін Сяргей Палхоўскі (330 кг), да 105 кг — брэстаўчанін Мікалай Патоцкі (359 кг), больш за 105 кг — пінчанін Аляксей Зелянкоў (375 кг).

"Турнір парадаваў вынікамі, — зазначыў А.Самадаеў. — Спаборніцтвы паказалі: у нас шмат маладых перспектыўных спартсменаў".

Ларыса ШЫГАНАВА.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 6.06.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №